МАЛА ЖЫЦЬ
ЯК ЖЫВЕЦЦА...

ГЛЯДЗЕЦЬ?
І БАЧЫЦЬ!

13

Выдаецца
з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

14 жніўня 2024 г.
СЕРАДА
№ 157 (30291)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ЦЫТАТА ДНЯ

Алена КОМЛІК, кансультант упраўлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны:

«Аднаразовая матэрыяльная дапамога да школы ў рамках праграмы «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека» даецца сем'ям, якія выхоўваюць траіх і больш дзяцей, гэта значыць, шматдзетным, незалежна ад даходу сям'і. Яна складае 30 працэнтаў БПМ па стане на 1 жніўня. Дапамога для ўсіх рэгіёнаў аднолькавая, у адзіным памеры плаціцца, цяпер складае каля 130 рублёў на кожнага школьніка. Выплаты пачаліся з 1 жніўня, працягнуцца да 1 верасня. Цяпер мы ўжо можам казаць, што ацэначна ў 2024 годзе такую дапамогу атрымаюць каля 115 тысяч шматдзетных сем'яў, у якіх выхоўваецца 240 тысяч дзяцей-школьнікаў».

На жнівеньскай сяўбе

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Трактарыст-механізатар сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва «50 гадоў Кастрычніка» Рэчыцкага раёна Дзмітрый ГЛЕЎКІ працуе ў гаспадарцы 12 гадоў. У свой час у СВК працавалі бацька, маці і дзед Дзмітрыя. Для яго гаспадарка стала першым працоўным месцам. З году ў год Дзмітрый павышае свой працоўны ўзровень. Яму даверана працаваць на дарагой сучаснай тэхніцы. Перадпасяўная апрацоўка глебы і сяўба — найважнейшыя сельгасзадачы для працаўнікоў вёскі, з якімі на выдатна спраўляецца трактарыст-механізатар.

КАРАТКА

• У сувязі з інцыдэнтам з украінскімі БПЛА Беларусь накіравала зварот старшыні Савета Бяспекі ААН, у якім прыцягнула ўвагу да неабходнасці спынення Украінай правакацыйных дзеянняў, якія нясуць пагрозу ўцягвання Беларусі ва ўзброены канфлікт і яго распаўсюджвання на іншыя краіны рэгіёна.

• **«Белавія» трапіла ў топ-12 найлепшых авіякампаній свету па якасці ежы, якую атрымліваюць пасажыры падчас палёту.**

«Ціхае паляванне» без экстрыму

Збіраючыся ў лес, паклапаціцеся аб тым, каб самастойна вярнуцца дахаты

Грыбны сезон — у самым разгары. А гэта значыць, што ў ратавальнікаў дабавілася работы. Кожны дзень яны дапамагаюць людзям, якія заблудзіліся, вярнуцца дамоў. У пошуку згубленых нярэдка задзейнічаны немалыя сілы: да супрацоўнікаў Міністэрства па надзвычайных сітуацыях падключаюцца міліцыянеры, ваеннаслужачыя, валанцёры і проста неабыякавыя грамадзяне. Замест таго каб выконваць свае штодзённыя задачы, яны вымушаны шукаць чалавека, які проста не падрыхтаваўся да «ціхага палявання», не паклапаціўся пра сябе.

СТАР. 4

Напярэдадні

У ЧАКАННІ СВЯТА СЛОВА

На фінальную стадыю выходзіць падрыхтоўка да Дня беларускага пісьменства ў Іванцевічах

У горадзе цяпер прывычныя з'явы — дом у рыштаваннях альбо мастак, які размалёўвае апору моста. Можна сустрэць і гараджаніна, які спяшаецца падфарбаваць фасад уласнага дома альбо агароджу. Яно і зразумела, райцэнтр жыве прадчуваннем свята. У пачатку жніўня прайшло пасяджэнне Нацыянальнага арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні Дня беларускага пісьменства. Старшыня аргкамітэта намеснік прэм'ер-міністра краіны Ігар ПЕТРЫШЭНКА пазнаёміўся з аб'ектамі, правёў нараду, на якой вызначаны тэрмін завяршэння будаўніча-рамонтных работ — 25 жніўня.

Фота Святланы ЯСКЕВІЧ.

Алея памяці.

СТАР. 5

ISSN 1990 — 763X

ДРАЎЛЯНЫ ДОМ ПАБУДАВАЦЬ СТАНЕ ПРАСЦЕЙ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 323, якім уносяцца змяненні ва Указ ад 23 лістапада 2020 года № 437 «Аб вядзенні лясной гаспадаркі і рэалізацыі драўніны», паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

Дакументам даецца права юрыдычным асобам, якія вядуць лясную гаспадарку і падпарадкаваным Кіраўніцтву спраў Прэзідэнта, ажыццяўляць рэалізацыю фізічным асобам дзелавой драўніны ў нарыхтаваным выглядзе па-за біржавымі таргамі па цэнах арганізацый-вытворцаў для будаўніцтва або рамонту жылых дамоў і гаспадарчых пабудоў. Раней, згодна з Указам № 437, такі механізм продажу быў прадугледжаны толькі для арганізацый Мінлясгаса.

Установлена, што ў выпадку асваення фонду аблвыканкамаў або адсутнасці ў ім пэўнай пароды круглых лесаматэрыялаў Мінлясгас можа набываць па-за біржавымі таргамі драўніну з любых відаў высечак для вытворчасці домакамплектаў (зборных драўляных збудаванняў і вырабаў) з далейшай іх рэалізацыяй фізічным асобам.

У мэтах патаннення для насельніцтва кошту домакамплектаў іх кошт разлічваецца з улікам выкарыстання таннай сыравіны з фонду аблвыканкамаў.

Таксама ўказам удакладнены аб'ёмы рэалізацыі дзелавой драўніны. Цяпер гэта да 70 куб. м на кожны аб'ект будаўніцтва або аднаўлення (раней — у сукупнасці на ўсе аб'екты) і да 10 куб. м для бягучага рамонту адзін раз у межах каляндарнага года ў сукупнасці на ўсе аб'екты (раней — па 10 куб. м на кожны аб'ект — жылы дом, дачу, садовы дом).

Указ накіраваны на задавальненне патрэб грамадзян у драўнянай сыравіне па прымальных цэнах, стымуляванне фізічных асоб да набыцця драўляных домакамплектаў для будаўніцтва жылля і рацыянальнае выкарыстанне лясных рэсурсаў.

Дакумент уступае ў сілу пасля афіцыйнага апублікавання.

У фармаце дыялогу

РЭФОРМА СТАМАТАЛАГІЧНАЙ ДАПАМОГІ І РАЗВІЦЦЁ РЭСПУБЛІКАНСКІХ НАВУКОВА-ПРАКТЫЧНЫХ ЦЭНТРАЎ

Наталля КАЧАНАВА правяла сустрэчы з калектывамі 7-й гарадской стаматалагічнай паліклінікі Мінска і РНПЦ «Кардыялогія»

Падобныя сустрэчы праходзяць ва ўсіх працоўных калектывах. Зверыць падыходы, адказаць на пытанні людзей, даведацца аб праблемах, якія існуюць на месцах, — такі прынцып работы Старшыні Савета Рэспублікі, у цэлым сенатарскага корпуса краіны.

ЖЫЦЬ ПА СВАІХ ЗАКОНАХ І ТРАДЫЦЫЯХ

Падчас размовы з супрацоўнікамі 7-й гарадской стаматалагічнай паліклінікі ўпаўнаважаны прадстаўнік Прэзідэнта ў горадзе Мінску выступіла з ініцыятывай стварэння на базе гэтай установы аховы здароўя рэспубліканскага стаматалагічнага цэнтра. Спікер запэўніла, што калектыў будзе захаваны, а магчымасці ўстановы аховы здароўя пашырацца.

На пачатку Старшыня Савета Рэспублікі звярнула ўвагу на тое, што мы жывём у важны для нашай краіны год — год 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, 30-годдзя інстытута Прэзідэнцтва, правядзення Усебеларускага народнага сходу. Наталля Качанава расказала аб паўнамоцтвах вышэйшага прадстаўнічага органа народаўладдзя, гістарычных перадумовах новага статусу УНС.

«За гэтыя 30 гадоў мы пабудавалі цудоўную дзяржаву, краіну, дзе можна і трэба жыць, краіну, якой патрэбна ганарыцца, — адзначыла спікер. — Усё ў нашых руках. Самае галоўнае, што ў нас ёсць суверэнітэт і незалежнасць. Суверэнная дзяржава — тое, што заваяваць, як часта кажа Прэзідэнт, было не так складана, бо мы апынуліся на развале Савецкага Саюза. А ўтрымаць суверэнітэт і незалежнасць вельмі няпроста. Яшчэ ў 2019 годзе і раней Прэзідэнт нам казаў аб тым, што ідзе геапалітычны перадзел свету і ўсё няпроста. І вы бачыце, колькі гарачых кропак з'яўляецца на карце свету. Аднапалярны свет знікне адназначна — да гэтага вяртання няма. Ёсць — і гэта дадзенасць — шматпалярны свет, дзе кожная краіна хоча жыць у сваёй дзяржаве, працаваць на сваёй зямлі, жыць па сваіх законах і традыцыях. Наша дзяржава развіваецца менавіта так».

Наталля Качанава падкрэсліла, што ў Канстытуцыі прапісана: Беларусь — сацыяльна арыентаваная дзяржава, на гэта нацэлена ўся работа. «Вы цудоўна разумееце: усё, што робіцца сёння ў дзяржаве, гэта як у сям'і — у кожнага ёсць свой кашалёк: колькі зарабіў, у такой ступені ты і можаш вырашаць свае задачы, — патлумачыла спікер. — Так і ў дзяржаве: колькі мы з вамі заробім грошай усе разам, такі ў нас і сфарміруецца бюджэт. Бюджэт фарміруецца — адпаведна, мы з вамі можам вырашаць усе задачы».

Старшыня Савета Рэспублікі акцэнтавала ўвагу на важнасці ўстойлівай работы эканомікі. «Тады, калі на развале Савецкага Саюза мы сказалі, што нашым прадпрыемствам быць, мы бачым, што ў выніку гэтага мы маем сёння вельмі добры эфект, нават нягледзячы на санкцыйны ціск, — канкрэтызавала спікер. — Мы сёння нармальна жывём, мы не згарнулі ні адну сацыяльную праграму».

Адным з найважнейшых кірункаў работы членаў Савета Рэспублікі, па словах Наталлі Качанавай, з'яўляецца міжнародная дзейнасць. «Мы вельмі шмат працуем па міжнародным парадку дня, выязджаем на шматлікага роду мерапрыемствы, — удакладніла яна. — Інтарэс да нашай краіны вялізны. Мы невялікая краіна (па тэрыторыі, па колькасці насельніцтва), але паглядзіце, як ва ўсім свеце нас ведаюць. І лічацца. Многія ад чагосьці сыходзілі, адмаўляліся, мы ж захавалі тое найлепшае, што было ў Савецкім Саюзе».

НОВАЯ ГАРАДСКАЯ АНКАЛАГІЧНАЯ ПАЛІКЛІНІКА І РЭАБІЛІТАЦЫЙНЫ ЦЭНТР

Упаўнаважаны прадстаўнік Прэзідэнта ў горадзе Мінску расказала аб планах па будаўніцтве ў сталіцы. Спікер паведаміла, што ў 2025 годзе ўсюды ў Мінску будзе вада з падземных крыніц. Акрамя таго, працягнецца будаўніцтва метро, ідзе ўзвядзенне інфекцыйнай бальніцы, у планах — новая гарадская анкалагічная паліклініка, рэабілітацыйны цэнтр.

Пры гэтым Наталля Качанава падкрэсліла, што сталіца не можа будавацца да бясконцасці. «Нельга сёння бяздумна будаваць новыя бальніцы, школы, дзіцячыя дашкольныя ўстановы, калі яны ў дастатковай колькасці, — удакладніла спікер. — Бо ўсё гэта грошы з бюджэту. Калісьці Аляксандр Рыгоравіч сказаў: паглядзіце і праінвентарызуйце Мінск, хапае вам плошчаў або не хапае, а сэканомленыя грошы лепш дайце на зарплату людзям, асабліва тым прафесійным катэгорыям, чыя праца нізка аплачваецца, — санітарам, медсёстрам, памочнікам урачоў».

Напрыканцы сустрэчы з працоўным калектывам 7-й гарадской стаматалагічнай паліклінікі Наталля Качанава адзначыла высокі ўзровень стаматалагічных паслуг, якія тут здзяйсняюцца. Старшыня Савета Рэспублікі заўважыла, што гэта рэгулярна гучыць з вуснаў людзей падчас прыёмаў грамадзян.

У размове з журналістамі Наталля Качанава падкрэсліла, што работа ў працоўных калектывах не спыняецца ніколі, незалежна ад таго, электаральны гэта перыяд ці не. «Мы, члены Савета Рэспублікі, як і ўсе службовыя асобы ў нашай краіне, абавязаны праводзіць сустрэчы ў працоўных калектывах, сустракацца з людзьмі па месцы жыхарства. Мы гэтую работу працягваем на пастаяннай аснове», — канкрэтызавала Старшыня Савета Рэспублікі.

Упаўнаважаны прадстаўнік Прэзідэнта ў горадзе Мінску патлумачыла, чаму наведала менавіта гэтую ўстанову аховы здароўя. «На этапе рэформавання стаматалагічнай дапамогі, якая аказваецца ў нашай краіне, калі плануецца стварыць рэспубліканскі цэнтр (магчыма, на базе мінскай клінікі), мне хацелася сустрэцца з гэтым калектывам, — удакладніла яна. — Калектыў цудоўны, ён карыстаецца заслужаным аўтарытэтам у нашых жыхароў. І калі ты атрымліваеш водгукі аб аказанні стаматалагічных паслуг, 7-ю паліклініку называюць заўсёды. Я ўбачыла, што людзям цікавая тая інфармацыя, з якой я выступала. А я перш за ўсё хацела даверсці інфармацыю аб той рабоце, якую праводзяць члены Савета Рэспублікі, працуючы ў Мінску і розных рэгіёнах нашай краіны, расказаць аб перспектывах далейшага развіцця Беларусі».

САЦЫЯЛЬНЫЯ АБАВЯЗКІ ВЫКОНВАЮЦЦА

Падчас сустрэчы з калектывам Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Кардыялогія» Наталля Качанава праінфармавала аб асноўных кірунках дзейнасці Савета Рэспублікі: заканатворчасці, міжнародных стасунках, рабоце з насельніцтвам. Таксама спікер распавяла аб знешніх выкліках, якія ствараюць пагрозу нашай краіне, сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі, дзе сістэме аховы здароўя ўдзяляецца асаблівая ўвага.

«Сацыяльная сфера сёння — гэта пільная ўвага з боку Прэзідэнта нашай краіны і ўрада, — падкрэсліла ўпаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы ў горадзе Мінску. — Усё, што датычыцца сацыяльнай сферы, для нас вельмі важна, бо калісьці дзяржава ўзяла на сябе сацыяльныя абавязкі, і сёння яны выконваюцца. Гэта няпроста, далёка няпроста, бо не кожная краіна мае магчымасць даваць такія сацыяльныя гарантыі, якія ёсць у нас. У нас 11 дапамог, што выплачваюць сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей. А самае галоўнае — да трох гадоў жанчына можа знаходзіцца ў дэкрэтным адпачынку, які аплачваецца».

Пры гэтым спікер звярнула ўвагу на тое, што развіваць сацыяльную сферу і вырашаць пытанні, якія стаяць, можна тады, калі эфектыўна працуе эканоміка. «Сістэма аховы здароўя павінна працаваць эфектыўна, — канкрэтызавала Наталля Качанава. — Дакладна пастаўлена задача: па будаўніцтве новых устаноў аховы здароўя ўсё павінна быць абгрунтавана. У горадзе Мінску мы разумеем, што інфекцыйную бальніцу варта будаваць. Інфекцыйная бальніца на Крапоткіна, вядома, не інфекцыйная бальніца для нашай краіны. Яна павінна быць базавым навуковым цэнтрам. Таму прынята рашэнне і ўжо пачата будаўніцтва гэтай бальніцы».

КВАЛІФІКАВАНАЯ ЯКАСНАЯ ДАПАМОГА — У ЛЮБЫМ РЭГІЁНЕ

Па словах Старшыні Савета Рэспублікі, Прэзідэнтам пастаўлена задача — аказваць кваліфікаваную якасную дапамогу ў любым рэгіёне нашай краіны, любому чалавеку. Спікер удакладніла, што кожны мае права трапіць у рэспубліканскі цэнтр. Для гэтага павінны добра працаваць рэгіянальныя службы — канкрэтныя задачы пастаўлены перад мясцовымі органамі ўлады.

«Рэспубліканскія навукова-практычныя цэнтры павінны быць магутным ядром сплаву навукі, сучасных тэхналогій і самых прафесійных і вопытных спецыялістаў, якія павінны працаваць у гэтых цэнтрах», — акцэнтавала ўвагу ўпаўнаважаны прадстаўнік Прэзідэнта ў горадзе Мінску.

У размове з супрацоўнікамі РНПЦ «Кардыялогія» закраналіся і тэмы даступнасці аказання медыцынскай дапамогі, кадравага патэнцыялу медыцынскай галіны, развіцця айчыннай фармацэўтычнай прамысловасці. Наталля Качанава звярнула ўвагу медыкаў на праблемы нарказалежнасці, уцягвання ў распаўсюджванне наркатычных сродкаў моладзі, масавага выкарыстання электронных курыльных сумесяў, педафіліі, незанятасці ў эканоміцы пэўнай катэгорыі працаздольнага насельніцтва. Пры гэтым спікер агучыла, што чакае ад медыцынскай супольнасці прапаноў, якія могуць пасадзейнічаць вырашэнню гэтых праблем.

Напрыканцы сустрэчы Старшыня Савета Рэспублікі падзякавала калектыву РНПЦ «Кардыялогія» за іх няпростую працу і пажадала моцнага здароўя людзям, якія робяць здаровымі іншых.

У размове з журналістамі Наталля Качанава паведаміла, што даўно хацела пабываць у гэтым працоўным калектыве. «Рэспубліканскія навукова-практычныя цэнтры, якія функцыянуюць у нашай краіне, нясуць сур'ёзную нагрузку па аказанні дапамогі ўсім жыхарам нашай краіны і тым, хто прыязджае, — канстатавала яна. — У нас працуюць добрыя спецыялісты, праводзяцца высокатэхналагічныя аперацыі. Перш за ўсё хацела пачуць пытанні, якія ёсць у тых, хто працуе ў нашых рэспубліканскіх навукова-практычных цэнтрах, давесці да нашых урачоў, медыцынскіх супрацоўнікаў, спецыялістаў тую інфармацыю, якой валодаем мы: аб тых заканадаўчых актах, аб той рабоце, якая праводзіцца Саветам Рэспублікі. Акурат цяпер мы працуем над Кодэксам аб ахове здароўя, таму для нас вельмі важна, што кажа медыцынская супольнасць для таго, каб у далейшым, прымаючы гэты кодэкс, мы разумелі, што гэтае рашэнне абсалютна правільнае».

Старшыня Савета Рэспублікі расказала, што сенатары выступілі з заканадаўчай ініцыятывай аб забароне ўжывання электронных цыгарэт і курыльных сумесяў. Спікер заўважыла, што гэтая прапанова паступіла менавіта ад медыцынскіх работнікаў, якія кажуць аб той небяспецы, што нясуць электронныя цыгарэты і курыльныя сумесі. У рабоце над гэтым законапраектам будзе ўлічвацца меркаванне спецыялістаў сістэмы аховы здароўя.

Вераніка КАНЮТА.

Спецыяльны рэпартаж

«З ДУШОЙ І ВЫДАТНЫМІ ЎМОВАМІ!»

Як сталічныя школы рыхтуюцца да новага навучальнага года

Сёння ў Мінску шмат робіцца для таго, каб навучальны працэс быў не толькі карысны, але і камфортны. На капітальны і бягучы рамонт установаў адукацыі штогод выдзяляюцца значныя сумы. Учора гатоўнасць некаторых агульнаадукацыйных устаноў праверылі кампетэнтныя спецыялісты на чале з памочнікам Прэзідэнта — інспектарам па горадзе Мінску Юрыем ФРАЛОВЫМ і намеснікам старшыні Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Андрэем СТРЫГЕЛЬСКІМ. Карэспандэнт «Звязды» таксама далучыўся да важнага рэйду і высветліў, якія работы былі зроблены, а што яшчэ наперадзе.

«ГЭТА АБСАЛЮТНА НОВАЯ ШКОЛА!»

Першым прыпыначным пунктам рабочай дэлегацыі стала СШ № 53, што на вуліцы Леаніда Бяды. Установа адукацыі закрылася на капітальны рамонт яшчэ мінулай восенню. І вось менш чым праз год маштабных работ школа амаль як новенькая. У сучасных класах — усё неабходнае абсталяванне. У прыярытэце яе адміністрацыі — камфорт і бяспека дзяцей.

«Калі ў мінулым жніўні стартавалі работы, задача была адна: да першага верасня гэтага года дзеці павінны вярнуцца ў родныя сцены, — распавяла **дырэктар СШ № 53 Наталля СЛЯПЯН**. — Сёння работы выкананы на 90 пра цэнтаў. Нягледзячы на тое, што аб'ект яшчэ не здадзены, мы актыўна займаемся добраўпарадкаваннем разам з заказчыкамі і падрадчыкамі. Унутры школы вымыты ўсе кабінеты, блішчаць вокны. Цяпер збіраецца мэбля, манціруецца абсталяванне. Школьны калектыў актыўна рыхтуецца да пачатку навучальнага года».

Паводле слоў дырэктара, за гэты час быў выкананы сапраўды вялікі аб'ём работ — зроблена ўцяпленне і афарбоўка фасада, замена даху і інжынерных камунікацый. У школе цалкам замянілі вокны, зрабілі рамонт абсалютна ва ўсіх кабінетах. Першага верасня ўстанова адчыніць свае дзверы тысячы вучням.

Паралельна з капітальным рамонтам будынка школы ідзе і бягучы рамонт спартыўнага стадыёна. «Цяпер усе сілы накіраваны на тое, каб да першага верасня ён таксама быў гатовы. У самой школе засталося расставіць парты, стварыць утульнасць. Актыўна ідзе афармленне: установка інфармацыйных стэндаў, дзяржаўнай сімволікі і завяршэнне фінальных крокаў да таго, каб першага верасня выглядаць годна», — падкрэсліла Наталля Сляпян.

Абноўленую школу ацаніў і Юрый Фралоў: *«Гэта ўстанова адукацыі, якая была на капітальным рамонце, пакінула вельмі прыемныя і станоўчыя ўражанні, яна сапраўды змянілася. Будынак школы 80-х гадоў, але калі я ўбачыў, што было зроблена ў ходзе капрамонту, склалася ўражанне, што гэта абсалютна новая школа! Была ўкладзена душа, створаны выдатныя ўмовы. У харчаблок закуплена новае абсталяванне, прыняты крэатыўныя рашэнні па ўнутраным размяшчэнні аб'ектаў. Таксама разгледзелі актавую залу. Як мне сказалі, гэтая школа з тэатральным ухілам, таму цяпер дзецям будзе вельмі зручна рэалізоўваць свае самыя смелыя творчыя ідэі і пачынанні. На дадзены момант тут даводзяць фінальныя штрыхі. Школа рыхтуецца да атрымання пашпарта аб'екта, і няма ніякіх сумненняў у тым, што яна будзе гатовая да пачатку новага навучальнага года»*.

Па словах памочніка Прэзідэнта, у нашай сталіцы больш за 700 устаноў адукацыі, рыхтуюцца да 1 верасня. Усюды праводзіцца вялікая работа, каб як след падрыхтавацца да навучальнага працэсу. *«Сёння школамі горада Мінска атрымана больш за 160 пашпартоў гатоўнасці з 245. У цэлым, на правядзенне капітальных і бягучых рамонтаў устаноў адукацыі затрачаны значныя сродкі. Гэта больш за 120 мільёнаў рублёў толькі сёлета. Вядома, дапамагаюць і арганізацыі горада, вучні і настаўнікі таксама працуюць, прыводзяць у парадак навакольную тэрыторыю. Усе разумеюць важнасць і значнасць гэтых работ»*, — падсумаваў памочнік Прэзідэнта — інспектар па горадзе Мінску.

«...ДОМ, ДЗЕ СЭРЦУ СТАНЕ ЦЁПЛА»

Наступным прыпынкам для дэлегацыі стала СШ № 86 у Партызанскім раёне сталіцы. Яна носіць імя палкоўніка міліцыі, ветэрана Вялікай Айчыннай вайны, удзельніка партызанскага руху Фамы Занько. У ёй быў праведзены касметычны рамонт. Па словах адміністрацыі, навучаецца каля 530 дзяцей.

Летась у школе былі адрамантаваны санвузлы. Сёлета за кошт бюджэтных сродкаў зроблена лесвіца з цікавым каляровым аздабленнем. Штогод гэтая ўстанова адукацыі становіцца прызёрам раённага конкурсу кабінетаў. Самымі прыгожымі прызнаны кабінеты геаграфіі і беларускай мовы і літаратуры. Сцены, парты і ўсё класнае абсталяванне афармлена сучасна, маляўніча, з QR-кодамі.

Вялікую ўвагу тут надаюць спорту. Для кіраўніцтва школы самае галоўнае — дзеці, якія ў ёй навучаюцца. Прадстаўнікі адміністрацыі адзначылі, што ва ўстанове адукацыі практычна няма цякучкі кадраў. Калектыў захаваны з 2001 года. Практычна ўсе настаўнікі прыйшлі сюды маладымі спецыялістамі, а пасля засталіся назаўжды. У школы ёсць нават свой дэвіз: «Школа — дом, дзе сэрцу стане цёпла».

«Сёння завяршаюцца работы па падрыхтоўцы школ да новага навучальнага года, — расказаў намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Андрэй Стрыгельскі. *— Было вызначана, што 15 жніўня — канчатковы тэрмін. Да яго павінны быць падпісаны пашпарты гатоўнасці міжведамаснымі раённымі камісіямі. Сёння гэтыя камісіі прынялі і падпісалі пашпарты гатоўнасці больш паловы сталічных школ. Гэта азначае, што школы фактычна гатовыя да новага навучальнага года».*

Ён адзначыў, што ў сталіцы былі праведзены маштабныя работы па падрыхтоўцы ўстаноў адукацыі. «Гэта і капітальныя, і бягучыя рамонты. Выдзелена даволі значнае фінансаванне. Сталіца атрымала пяць школ пасля комплекснага капітальнага рамонту. Сярод іх — 53-я школа, якую мы з вамі наведалі. Фактычна яна атрымала другое нараджэнне. Пры правядзенні капітальнага рамонту быў ужыты комплексны падыход. Гэта не толькі інжынерныя сеткі, дах, узмацненне апорных канструкцый, але і эстэтызацыя адукацыйнага працэсу і прасторы», — дадаў намеснік старшыні Мінгарвыканкама.

Многае зроблена па замене аконных блокаў. «Сёння мы кажам, што фактычна ва ўсіх школах сталіцы драўляныя аконныя блокі заменены на сучасныя шклопакеты. Таксама быў праведзены рамонт спартыўных залаў, санітарных вузлоў, спортпляцовак. Больш за 60 мільёнаў рублёў з гарадскога бюджэту накіравана на правядзенне бягучых рамонтаў і больш за 65 мільёнаў рублёў — на правядзенне капітальных рамонтаў», — сказаў Андрэй Стрыгельскі.

Па яго словах, да першага верасня ў сталіцы 241 агульнаадукацыйная школа адчыніць свае дзверы для вучняў, а таксама тры прыватныя ўстановы адукацыі. «Апошнія таксама актыўна рыхтуюцца да новага навучальнага года, і міжведамасная камісія ацэніць іх ступень падрыхтоўкі. А яшчэ ў сталіцы адкрываецца новая школа ў мікрараёне Лябяжы, куды пераязджае 42-я гімназія (яна атрымлівае новы будынак). Дзеці, якія пражываюць у дадзеным мікрараёне, таксама прыйдуць туды вучыцца», — падагульніў ён.

З ЛЮБОЎЮ ДА РОДНАЙ МОВЫ І СПОРТУ

Пабывалі мы і ў гімназіі № 14, што недалёка ад універмага «Беларусь». Тут заканчваецца капітальны рамонт спартыўнага стадыёна. Навучанне ў гімназіі праходзіць на беларускай мове. Таксама ў ёй удзяляецца асаблівая ўвага захаванню нацыянальнай культуры. Больш падрабязна пра гэта распавяла **дырэктар гімназіі № 14 Марыя ГАРОХАВА**:

«Наша гімназія — адна з пяці сталічных устаноў адукацыі, дзе навучальны працэс адбываецца на беларускай мове. Сёння ў нас навучаецца 784 вучні. На першага верасня мы набяром тры першыя класы па 28 чалавек. У нас нават быў конкурс. Спадзяёмся, што новая сотня дзяцей, якія папоўняць дружную сям'ю нашай гімназіі, будзе гэтак жа адказна, будзе шанаваць беларускую мову, любіць родную зямлю і актыўна займацца спортам».

Ёсць тут і профільны клас грамадзянска-патрыятычнага выхавання, педагагічны клас. Адміністрацыя гімназіі ставіць задачу навучання і выхавання будучых педагогаў, якія змогуць арганізоўваць навучальны працэс на роднай беларускай мове. У навучальнай установе робіцца многае і для захавання беларускай нацыянальнай культуры. На базе гімназіі ёсць музей вясковага побыту, музей музычных інструментаў, музей гісторыі партызанскага руху ў Беларусі. Велізарнай папулярнасцю ў жыхароў Заводскага раёна карыстаецца басейн. У гэтым годзе была праведзена яго рэканструкцыя, зроблена гідраізаляцыя.

«Сёння ва ўсю ідзе капітальны рамонт нашага стадыёна. Упэўнена, што ён будзе карыстацца попытам. Работы вядуцца вельмі актыўна, згодна з графікам. Спадзяёмся, што да пачатку навучальнага года адбудзецца адкрыццё: укладваюцца апошнія метры асфальту, затым — установка гульнявога абсталявання, дарожак, валейбольнага, футбольнага поля і іншых аб'ектаў», — дадала дырэктар.

Дарэчы, у роднай гімназіі Марыя Іванаўна працуе ўжо 30-ы год. «Гэта даволі значны перыяд. Розныя былі часы стаўлення да навучання на беларускай мове, але сёння адукацыя на ёй карыстаецца попытам. У нас няма цяжкасцяў з наборам дзяцей. Многія бацькі, якія любяць сваю нацыянальную культуру, паважаюць беларускую мову, усведамляюць сябе яе носьбітамі, імкнуцца навучаць на ёй і сваіх дзяцей. Таму першакласнікаў мы заўсёды набіраем без праблем, — адзначыла дырэктар гімназіі. — Няма складанасцяў для бацькоў і дзяцей. Яны з лёгкасцю ўступаюць у адукацыйны працэс на беларускай мове і асвойваюць школьныя навукі без усялякіх перашкод. Дзеці прыходзяць да нас з задавальненнем. Многія ганарацца тым, што яны лепш за іншых ведаюць родную мову, маюць багаты слоўнікавы запас, могуць растлумачыць і расказаць некаторыя дзеянні і, безумоўна, ведаюць больш пра творчасць беларускіх паэтаў, прадстаўнікоў культуры. Менавіта гэтаму і садзейнічае наша ўстанова адукацыі».

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ, фота аўтара.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Расіі сёлета папярэдзілі 110 тэрактаў



Праваахоўныя органы прадухілілі 110 тэрактаў у Расіі з пачатку 2024 года. Аб гэтым заявіў старшыня Нацыянальнага антытэрарыстычнага камітэта (НАК), дырэктар ФСБ Аляксандр Бортнікаў, паведаміла ТАСС. «За падрыхтоўку і ўчыненне тэрарыстычных злачынстваў, апраўданне і прапаганду тэрарызму, фінансаванне тэрарыстаў і аказанне ім дапамогі затрымана больш за 1050 асоб», — прывялі словы Аляксандра Бортнікава ў інфармацыйным цэнтры НАК. Акрамя таго, сёлета было выяўлена 45 ячэек міжнародных тэрарыстычных арганізацый, якія займаліся вярбоўкай жыхароў Паўночнага Каўказа і мігрантаў з Цэнтральнай Азіі. Аляксандр Бортнікаў 13 жніўня правёў пасяджэнне НАК па пытаннях павышэння гатоўнасці суб'ектаў РФ да адбіцця тэрарыстычных замахаў і задачах прафілактыкі тэрарыстычных пагроз ва ўмовах правядзення спецыяльнай ваеннай аперацыі. Адкрываючы пасяджэнне, старшыня НАК, у прыватнасці, адзначыў, што Кіеў здзейсніў тэрарыстычны напад на Курскую вобласць пры падтрымцы калектыўнага Захаду. Мэтамі атакі, паводле яго слоў, сталі мірнае насельніцтва і грамадзянскія аб'екты.

Большасць амерыканцаў адчуваюць песімізм у дачыненні да палітычнай сітуацыі ў ЗША

Дзве траціны грамадзян ЗША песімістычна глядзяць на палітычную сітуацыю ў краіне. Пра гэта сведчаць вынікі апытання грамадскай думкі, праведзенага даследчым цэнтрам NORC для агенцтва Associated Press, паведаміла ТАСС. 32 працэнты рэспандэнтаў сказалі, што настроены «вельмі песімістычна», 34 працэнты ўдзельнікаў апытання ацанілі сваё стаўленне як «песімістычнае ў той ці іншай ступені». Аб аптымізме ў сувязі з палітычнай сітуацыяй у ЗША заявілі толькі 16 працэнтаў апытаных, 18 працэнтаў не змаглі ахарактарызаваць сваю пазіцыю ні як пазітыўную, ні як негатыўную. Абсалютная большасць рэспандэнтаў — 72 працэнты — палічылі, што іх краіна рушыць «няправільным шляхам».

«Ціхае паляванне» без экстрыму

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

З пачатку года на раніцу 13 жніўня ў лясах Беларусі згубіліся 194 чалавекі, у тым ліку 25 дзяцей. 12 аматараў збору грыбоў і ягад дагэтуль не знайшлі...

Згубіцца можна нават у кукурузе

Практычна ўсе сітуацыі падобныя адна на адну — пайшлі ў лес і не вярнуліся. Як правіла, трывогу б'юць сваякі грыбнікоў або ягаднікаў, якія іх не дачакаліся. Тэлефануюць ратавальнікам або міліцыянерам і самі пацярпелыя. Мабільны тэлефон, пакладзены ў кішэню, дазваляе не толькі паведаміць спецыялістам аб сваёй бядзе, але і дапамагае ў пошуку.

Так, жанчына, якая заблудзілася разам з дачкой у лясным масіве Кіраўскага раёна, самастойна паведаміла аб гэтым ратавальнікам. Як пасля расказаў **старшы інструктар-ратавальнік ПАСП-13 вёскі Стайкі Алег СВІРЫД,** яны звязаліся з мужам жанчыны, які патлумачыў, дзе звычайна з жонкай збіраюць грыбы. На месцы супрацоўнікі МНС знайшлі аўтамабіль пацярпелых і пачалі ўключаць сірэну, каб тыя маглі іх пачуць. У выніку маці з дачкой выйшлі на гук сірэны аўтацыстэрны. Яны знаходзіліся ў здавальняючым стане, у медыцынскай дапамозе не мелі патрэбы.

Аб тым, што заблукаў, ратавальнікам паведаміў і мужчына, што збіраў буякі ў лесе каля вёскі Суцін Пухавіцкага раёна. Каля шасці раніцы пенсіянер сышоў у лес ў ягады, а вось самастойна выйсці з лесу не змог. Дзякуючы мабільнаму тэлефону, ратавальнікі пастаянна знаходзіліся на сувязі з мужчынам. Ноччу пацярпелага знайшлі ў балоцістай мясцовасці. На шчасце, у медыцынскай дапамозе не было неабходнасці.

Губляюцца не толькі аматары «ціхага палявання». Днямі ратавальнікам паступіла паведамленне аб тым, што патрабуецца дапамога ў пошуку грамадзяніна, які не можа выбрацца з кукурузнага поля. Здарэнне адбылося паблізу вёскі Гусакі Нясвіжскага раёна. Як высветлілася, каля 12.00 мужчына пайшоў у кукурузу і не вярнуўся. Сувязь са згубленым не падтрымлівалася — мабільнага тэлефона ў яго з сабой не было. Пошукі працягваліся больш за суткі. На наступны дзень, дзесьці каля поўдня, згублены быў знойдзены ў полі на адлегласці каля чатырох кіламетраў ад месца жыхарства. Мужчына

меў хранічныя захворванні. Вядома, ён нават падумаць не мог, што трапіць у бяду, таму і лекаў з сабой не браў.

А ратавальнікі, між іншым, настойліва рэкамендуюць падумаць пра здароўе, перш чым пайсці ў лес ці кудысьці яшчэ. Калі ўжо вельмі хочацца, людзям з хранічнымі захворваннямі абавязкова трэба ўзяць з сабой неабходныя медыцынскія прэпараты, бо можа здарыцца, як паказвае жыццё, усякае, і невядома, калі чалавек ізноў акажацца дома.

У лес з дзецьмі — рызыкоўна

Перш чым адпраўляцца ў лес з дзецьмі, варта падумаць, браць іх з сабой або не. Дастаткова ўсяго на некалькі хвілін пакінуць непаўналетніх без увагі, як можа здарыцца ўсё што заўгодна. У нядзелю, напрыклад, звыш 300 чалавек шукалі трохгадовага хлопчыка ў Шчучынскім раёне. Паведамленне аб тым, што ў лесе згубілася дзіця, паступіла ратавальнікам у 14.28. Бацька хлопчыка расказаў, што разам з сынам яны адправіліся ў грыбы ў лес каля Шчучына. Мужчына збочыў з дарогі, каб паглядзець, ці ёсць грыбы, і на некалькі хвілін страціў хлопчыка з-пад увагі. Самастойныя пошукі выніку не прынеслі — на крык дзіця не адгукалася. Бацька быў вымушаны звярнуцца па дапамогу да спецыялістаў.

Маленькага грыбніка шукалі супрацоўнікі МНС, РАУС, вайскоўцы, добраахвотнікі, валанцёры пошукава-ратавальнага атрада і мясцовыя жыхары. У пошукавай аперацыі была задзейнічана 21 адзінка тэхнікі. У 18.26 мясцовы жыхар знайшоў хлопчыка на адлегласці каля кіламетра ад месца знікнення. Для абследавання дзіця даставілі ва ўстанову аховы здароўя, пасля чаго адпусцілі дадому.

У чэрвені непаўналетняга шукалі ў лясным масіве паблізу вёскі Салацце, што пад Гродна. Сям'я прыехала адпачыць на возера з начлегам. Раніцай сямігадовы хлопчык пайшоў пагуляць па лесе. Праз некаторы час ён не вярнуўся — бацькі забілі трывогу. Школьнік не адгукаўся на крык, тэлефона з сабой у яго не было. Прачасаўшы масіў паблізу месца стаянкі самастойна і не знайшоўшы сына, бацькі паведамілі аб тым, што здарылася, у міліцыю. Для пошукаў былі прыцягнуты ратавальнікі, супрацоўнікі раённага аддзела ўнутраных спраў, пагранічнікі і прадстаўнікі Чырвонага Крыжа. Сына вярнуў бацькам жыхар абласнога цэнтра, які прыехаў у лес збіраць ягады. На шчасце, у медыцынскай дапамозе непаўналетні не меў патрэбы.

Яркае адзенне і зараджаны тэлефон

Як звяртае ўвагу **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Анастасія ШВАЙБОВІЧ,** калі вы запланавалі адправіцца ў лес у грыбы ці ў ягады, перш за ўсё пацікаўцеся, ці можна ў вашым раёне наведваць лес. «Аператыўна даведацца інфармацыю можна на інтэрактыўнай карце на сайце МНС, — расказвае прадстаўнік ратавальнага ведамства. — Калі дзейнічае забарона, то ўваходзіць у лес нельга, у тым ліку і для збору грыбоў, ягад ці проста шпацыраў. Калі ўведзена абмежаванне, то нельга заязджаць на транспарце, разводзіць вогнішчы. Не забывайце аб гэтых важных умовах. Калі ўсё ж вашым планам нічога не замінае, да паходу ў лес трэба падрыхтавацца. Пачаць варта з адзення. Яно павінна быць непрамакальным і абавязкова з яркім элементам (кепка, хустка). Вазьміце з сабой зараджаны мабільны тэлефон, ваду і ежу, неабходныя лекі».

Таксама не лішнім будзе «ўзброіцца» компасам і картай. Калі вы дрэнна арыентуецеся на мясцовасці, то ратавальнікі ўвогуле рэкамендуюць не ісці ў лес. Калі ўсё ж такі пайшлі, не забудзьцеся папярэдзіць сваякоў або суседзяў аб тым, куды збіраецеся. Раскажыце аб вашым маршруце і ўдакладніце час вяртання.

Без панікі!

Калі вы заблукалі, першае, што рэкамендуюць супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, — не панікаваць. Пасля — варта прыслухацца: гукі нярэдка дапамогуць зарыентавацца. Шум трактара, напрыклад, чуваць за 3-4 кіламетры, брэх сабакі — за 2-3 кіламетры, цягнік — за 10 кіламетраў. Ідзіце на гук і абавязкова выйдзеце да людзей. У населены пункт прывядуць і лініі электраперадачы, прасекі, сцяжынкі. Калі на шляху сустрэўся ручай ці рака, ідзіце ўніз па плыні — яны заўсёды прывядуць да людзей.

Самастойна выбрацца з лесу не ўдаецца? Патэлефануйце ў МНС (па нумары 112) і паведаміце, з якога населенага пункта і якога раёна вы ўвайшлі ў лес; апішыце, што бачыце па баках. Пачынае цямнець — зарыентуйцеся на мясцовасці і падумайце, дзе арганізаваць начлег. Для яго падыдзе яма ад вывернутага з коранем дрэва. З галінак зрабіце прытулак накшталт будана і подсціл з падручных матэрыялаў. Старонкі газеты, засунутыя пад адзенне, зменшаць цеплааддачу ўдвая. Такі ж эфект дае і лістота, набітая пад адзенне. Паспрабуйце знайсці ваду. Арганізуючы начлег, паклапаціцеся, каб тыя, хто вас шукае, не прайшлі міма. Напрыклад, павесьце на кусты кепку, насоўку ці ліст паперы, абламіце галінкі, каб прыцягнуць увагу.

Калі вы апынуліся ў лесе без тэлефона і не можаце самастойна выйсці да людзей, у любым выпадку супакойцеся і настройцеся на добры зыход. Ніхто ў бядзе вас не пакіне. А каб увогуле не трапіць у такую сітуацыю, збіраючыся на «ціхае паляванне», абавязкова прыслухайцеся да парад ратавальнікаў. Паклапаціўшыся аб уласнай бяспецы, вы пазбегнеце непрыемнасцяў, а паход у грыбы ці ў ягады будзе толькі ў радасць.

Вераніка КАНЮТА.
Фота прэс-службы МНС.

Падзея

У рытме «Бібліятэчнага лета»

Танцы і кнігі — гэта цудоўна. Але што будзе, калі сумясціць дзве гэтыя рэчы? Атрымаецца цудоўны баль «Бібліятэчнае лета», які ўпершыню прайшоў 10 жніўня ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

У гэты дзень у рытме танца ў бібліятэцы закруцілася каля ста падрыхтаваных танцораў з розных гарадоў Беларусі. Гэта і мінскі «Dancing time», і гомельскі «Сярэбраны век», і бабруйскі «Паланэз». Акрамя таго, усе ахвотныя маглі паўдзельнічаць у танцавальных майстар-класах і пагрузіцца ў чароўную атмасферу балю.

Нашу ўвагу прыцягнула пара з бабруйскага аматарскага ансамбля бальнага танца «Паланэз», якая вельмі ўпэўнена і грацыёзна вальсавала па зале. Ларыса танцуе ўжо пяць гадоў, менавіта яна і прывяла ў ансамбль свайго мужа Сяргея.

— Гэта мерапрыемства — выдатная магчымасць яшчэ раз сустрэцца з нашымі сябрамі з іншых танцавальных калектываў. Мы ўжо добра ведаем адно аднаго па розных балях, — дзеліцца Ларыса.

— А яшчэ выдатна, што ўсё гэта праходзіць у той самай бібліятэцы, якую будавалі ўсім грамадствам, — дапаўняе Сяргей.

Па іх словах, вельмі важна падтрымліваць культуру бальнага танца.

— Гэта выхаванне духоўных каштоўнасцяў, а калі ў нацыі моцны дух — значыць, нацыя моцная, — заключылі яны.

Уразіла нас яшчэ адна ўдзельніца бабруйскага танцавальнага калектыву. Убор Святланы быў прадуманы літаральна да дробязяў: ад веера на вытанчаным ланцужку да зіхатлівай тыяры. Як аказалася, Святлана ўсё жыццё займалася танцамі, і ўдзел у балях калісьці быў яе запаветнай марай, якая з часам увасобілася ў рэальнасць.

— Баль — гэта прыгажосць, радасць і захапленне з прымессю рызыкі і страсці. Адным словам, гэта цэлая культура. І людзі, якія займаюцца бальнымі танцамі, — яны крыху іншыя, як быццам увесь час захопленыя і закаханыя ў гэты свет, — дзеліцца думкамі Святлана.

Паводле яе слоў, да балю калектыў рыхтаваўся некалькі месяцаў. Вучылі танцы, адпрацоўвалі складаныя элементы, але ўсе намаганні былі таго вартыя.

— Люблю працэс падрыхтоўкі да гэтага свята. Яшчэ за некалькі месяцаў прадумваеш, якая сукенка, якая прычоска, якія завушніцы. Усё гэта бязмерна радуе, — расказвае яна.

Аднак «Бібліятэчнае лета» не абмяжоўвалася бальнымі танцамі.

Паводле слоў **намесніка генеральнага дырэктара — дырэктара па ідэалогіі, сацыякультурнай і выдавецкай дзейнасці Людмілы ВЫСОЦКАЙ,** у гэты дзень у бібліятэцы для наведвальнікаў былі адкрыты ўсе залы.

— Нацыянальная бібліятэка Беларусі ўжо стала знакавай культурнай пляцоўкай. Тут увесь час праходзяць розныя мерапрыемствы. У нас адкрываюцца выставы, праходзяць пленэры, майстар-класы. У гэтым годзе ўпершыню праводзім баль. Вельмі прыемна, што людзі падтрымліваюць такія ініцыятывы, — адзначае яна.

Таксама Людміла Высоцкая адзначыла, што бібліятэка мае задумку прадоўжыць традыцыю правядзення баляў. Быць можа, напярэдадні Калядаў тут ізноў загучыць музыка і закружацца ў танцы дзясяткі пар.

«Бібліятэчнае лета» здзіўляла цікавай праграмай з майстар-класамі, экскурсіямі і інтэрактывамі. Мы зайшлі ў «Майстэрню рэстаўратара», якая размясцілася ў зале беларускай літаратуры. Там дзеці і дарослыя займаліся карпатлівым, але вельмі карысным заняткам — рэстаўрацыяй друкаваных выданняў.

— Многія людзі для таго, каб «паправіць» разарваную кнігу, выкарыстоўваюць скотч. Аднак калі б яны ведалі пра больш эстэтычны спосаб, то многія кнігі былі б у добрым стане значна даўжэй. На майстар-класе мы

паказваем просты спосаб рэстаўрацыі з дапамогай спецыяльнай стужкі. Яна вельмі тонкая, практычна незаўважная, і купіць яе не складаней чым скотч, — распавядае **бібліятэкар 2-й катэгорыі Маргарыта РЫБАЛТОЎСКАЯ.**

Падымаемся на трэці паверх і трапляем у чароўны свет класічнай музыкі. Зала нотных і аўдыёвізуальных дакументаў. Тут госці балю маглі паслухаць вінтажныя вінілавыя кружэлкі і пайграць на музычных інструментах. Дарэчы, менавіта ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі самы буйны архіў кружэлак, які складае каля 25 тысяч адзінак. Клапатлівымі бібліятэкарамі для наведвальнікаў былі складзены тэматычныя экспазіцыі, па замове тут маглі паставіць любую кружэлку.

Усяго баль складаўся з трох танцавальных аддзяленняў. Адпачыць паміж імі можна было на любой з пляцовак. Кожны мог знайсці сабе занятак па душы. Хтосьці адправіўся на экскурсію па выставе, прысвечанай Эдгару Дэга, хтосьці вырашыў наведаць музычна-літаратурную гасцёўню, а хтосьці нават праверыць свае дэтэктыўныя здольнасці і паўдзельнічаць у гульнях «Шэрлак Холмс» і «Знікненне на французскім прыдворным балі XVIII стагоддзя».

Лізавета ГОЛАД,
фота аўтара.

У ЧАКАННІ СВЯТА СЛОВА

ГОРАД ПРЫРАСТАЕ ПРЫГАЖОСЦЮ

— Усе шчыруем для таго, каб горад сустрэў гасцей прыгожым, прыбраным, памаладзелым, — сказаў карэспандэнту «Звязды» **старшыня Івацэвіцкага райвыканкама Уладзімір БЯЛОЎ**. — Кіраўніцтва выканкама, прадпрыемствы і ўстановы раёна, яго жыхары настроены правесці свята годна, з размахам, паказаць гасціннасць нашай краіны, павагу да мовы і культуры, да сваіх каранёў.

— Што для вас як кіраўніка раёна ўяўляецца самым галоўным у вялікім працэсе падрыхтоўкі, які выходзіць на фінальную стадыю?

— Галоўнае — прыцягнуць, задзейнічаць як мага больш людзей, арганізацый, устаноў. Хочацца, каб справа падрыхтоўкі да Дня беларускага пісьменства стала справай агульнай для ўсяго раёна, каб кожны адчуў сваё дачыненне да будучай падзеі, тады і свята будзе больш яркім, запамінальным. Плануем яшчэ правесці адзін-два суботнікі, каб нанесці апошнія штрыхі парадку на вуліцы. Арыентуем гараджан на тое, каб упрыгожылі свае дамы і падворкі, каб зрабілі пасільны ўнёсак у агульную справу. Скажам, жыхар прыватнага сектара можа ўзяць вядро, рыдлёўку ды крыху палепшыць тэрыторыю і за сваёй агароджай. Другі дапаможа неяк інакш. Так было з самага пачатку падрыхтоўкі.

Гэта свята напрамую звязана з нашымі каранямі, нашай культурай, нашымі славутасцямі, якімі багатая Івацэвіччына. Таму асабліва важна, каб як мага больш людзей адчулі сябе датычнымі да падзеі, што і паспрыяе справе ўмацавання адзінства.

Фота ТГ-канала «Ивацевичи.News».

Горад абнаўляецца і прыгажэе.

— Наколькі я ведаю, падрыхтоўка пачалася яшчэ летась. Калі кароткі, што зроблена, чым прырост райцэнтр?

— Найперш прырос прыгажосцю. Горад на вачах пераўтвараецца. Па некаторых вуліцах пракладзены новыя інжынерныя камунікацыі; шэраг дамоў, асабліва ў цэнтральнай частцы горада, перажыў рамонт, фасады іх атрымалі новы выгляд у арыгінальным колеравым вырашэнні. Змяніліся да непазнавальнасці таксама фасады адміністрацыйных будынкаў, магазінаў. На змену блякламу аблічча прыходзіць спектр спакойных тонаў з яркімі акцэнтамі, такім чынам кожнае збудаванне набывае індывідуальны характар. Пракладваюцца асфальт і тратуарныя дарожкі. На плошчы Леніна падыходзіць да завяршэння рэканструкцыя фантана.

Па праграме падрыхтоўкі да свята нямала зроблена па абектах сацыяльнай сферы. З пачатку года вядзецца рамонт у раённай паліклініцы. Будынак адрамантавалі і звонку, і ўнутры. Заменены вокны, іншае аблічча набыў фасад. Новы ганак адпавядае цяпер патрабаванням безбар'ернага асяроддзя. Зроблены капітальны рамонт другога паверха. На першым паверсе падрыхтавана памяшканне для камп'ютарнага тамографа. З'яўленне КТ у Івацэвічах стала падзеяй для нас, мантаж высокатэхналагічнага абсталявання завершаны, хутка тамограф пачне работу на карысць пацыентаў. У бальніцы чакаюць таксама новы рэнтгенаўскі апарат.

Шмат чаго зроблена для ўстаноў адукацыі. Школы атрымалі новыя спартыўныя пляцоўкі, пачалася работа па цеплавой рэабілітацыі чацвёртай школы, пракладзены бегавыя дарожкі на стадыёнах першай і чацвёртай школ, да першай школы праклалі асфальт на пад'ездзе. Гэтыя работы будуць праводзіцца і далей, аж да канца года... Вось, прасілі пералічыць коратка, а атрымалася доўга, і можна яшчэ шмат чаго называць, бо робіцца сапраўды многа. Вядзецца добраўпарадкаванне тэрыторый дваро ў, робяцца пад'езды да дзіцячых садкоў, штодня з'яўляюцца новыя клумбы, кветнікі. Усё гэта застанецца для жыхароў як напамін пра Дзень беларускага пісьменства.

А яшчэ застануцца арыгінальныя арт-аб'екты, выкананыя да гэтай знакавай падзеі. Каля раённай бібліятэкі, напрыклад, установлены аб'ект пад назвай «Лятучыя кнігі». Дарэчы, бібліятэка як адзін з галоўных аб'ектаў свята таксама перажыла рамонт і абнаўленне. Але ж галоўнае — сама праграма свята, надзвычай насычаная, багатая на мерапрыемствы і падзеі, накіраваныя на папулярызацыю чытання, любові да кнігі, да роднага слова. Самы актыўны ўдзел у праграме возьмуць нашы ўстановы і арганізацыі, творчыя калектывы і людзі. Так што чакаем гасцей, пастараемся не расчараваць.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Фота ТГ-канала «Ивацевичи.News».

Падчас адкрыцця абноўленай дошкі Гонару (справа — старшыня райвыканкама Уладзімір БЯЛОЎ).

ПАЭТЫЧНЫ ДВОРЫК І ПРОМНІ АСВЕТНІЦТВА

Да Дня беларускага пісьменства рыхтуюцца ўсе арганізацыі і ўстановы раёна. Першая ў гэтым шэрагу — раённая бібліятэка імя Піліпа Пестрака. Знаходзіцца яна ў вялікім і светлым будынку, узведзеным у 1956 годзе.

— Сёлета ўстанова перажыла рамонт і абнаўленне, — расказала **дырэктар Івацэвіцкай раённай бібліятэчнай сеткі Галіна МІХНЮК**. — Абноўлены фасад выглядае вельмі стыльна. Цалкам памянялася пляцоўка перад уваходам, на змену старым ліпам прыйшла зялёная зона з лаўкамі, цэнтрам якой стаў арт-аб'ект «Лятучыя кнігі». Ён уяўляе сабой гэтакі металічны «букет», дзе кожная кветка — кніга з цытатай аднаго з нашых класікаў.

Таксама праведзены рамонт у памяшканнях абанемента і чытальнай залы, абноўлены холы на паверхах, установа атрымала новую мэблю, тэхніку; зараз супрацоўнікі развешваюць карціны і абстаўляюць канферэнц-залу, дзе можна будзе праводзіць мерапрыемствы, чытацкія канферэнцыі, круглыя сталы. На першым паверсе ўстаноўлены інфармацыйны інтэрактыўны стэнд.

Бібліятэка актыўна працуе над абнаўленнем фонду. Галіна Міхнюк расказала, што літаральна нядаўна Саюз пісьменнікаў Беларусі зрабіў падарунак: яго старшыня Алесь Карлюкевіч перадаў каля тысячы экзэмпляраў кніг беларускіх аўтараў. І падкрэсліла, што новая літаратура паступае ў асноўным ад беларускіх выдавецтваў.

Да свята бібліятэка рыхтуе сваю пляцоўку. Усе нюансы адкрыцця арганізатары пакуль трымаюць у сакрэце, але вядома, што ў цырымоніі яна таксама будзе задзейнічана. У скверы Перамогі непадалёку пакажуць рэканструкцыю ваенных падзей, якія адбываліся ва ўрочышчы «Хаваншчына», затым удзельнікі мерапрыемства накіруюцца да бібліятэкі, якая сустрэне гасцей выставай-прэзентацыяй. Апошняя ўключае ў сябе кніжную выставу «Івацэвіцкі раён: гісторыя і сучаснасць» з шэрагу раздзелаў. Напрыклад, Целяханская бібліятэка рыхтуе экспазіцыю «Генацыд — боль і памяць». Супрацоўнікі падыходзяць да работы творча, цікава афармляюць сваю выставу. Бібліятэкар з Гошчава Алена Ляўчук нават правядзе майстар-клас па вырабе сувеніраў з салёнага цеста.

А літаратурная пляцоўка «Паэтычны дворык» прывабіць аматараў паэзіі: дзеці і дарослыя прачытаюць вершы аўтараў, якія прадстаўлены ў кампазіцыі «Лятучыя кнігі». Школьнікі рыхтуюць яшчэ тэатралізаваную дзею паводле вершаў Янкі Купалы. Віктарына «Промні асветніцтва» збярэ аматараў і знаўцаў беларускай літаратуры. Адным словам, цікавінак будзе многа, пра ўсе Галіна Зумаданінаўна не расказала ў жаданні захаваць інтрыгу. Так што варта будзе ісці і глядзець.

У ПАМЯЦЬ ПРА АНАТОЛЯ ГАЛУШКУ

Таксама варта наведаць музейны дворык Івацэвіцкага гісторыка-краязнаўчага музея. Як расказала **дырэктар музея Раіса ГОРБАЧ**, дворык з'явіўся ў выніку добраўпарадкавання тэрыторыі. Тут абсталявалі пляцоўку, дзе можна будзе ладзіць невялікія выставы і прэзентацыі. Праўда, пакуль яшчэ дворык у рыштаваннях, але будаўнікам застаецца дзень-два. А першым мерапрыемствам у новым дворыку стане прэзентацыя твораў земляка Анатоля Галушкі. Чалавек унікальнага лёсу, мастак, паэт, які пераадолеў уласную нерухомасць. Прыкаваны да ложка, ён стварaў карціны, трымаючы пэндзаль у зубах, а літаратурныя творы дыктаваў родным людзям. Лаўрэат абласной літаратурнай прэміі імя Уладзіміра Калесніка, ганаровы грамадзянін Івацэвіцкага раёна А. Галушка, на жаль, нядаўна пайшоў з жыцця. Засталіся вершы, засталіся карціны, якія і пакажуць у дворыку. «Мы хочам нагадаць пра чалавека, улюбёнага ў харство свету і родныя краявіды. У нас шмат людзей ведае пра Анатоля Галушку, ведае яго творчасць, — гаворыць Раіса Іванаўна. — Абавязкова прагучаць яго радкі. Аўтар здолеў узняцца над уласным болем, над сваёй нерухомасцю і сваёй творчасцю разбурыў перашкоды, што ўзніклі з-за абмежаваных магчымасцяў. Таму і гучаць яго, несумненна, выпакутаваныя радкі надзвычай шчыра».

Філіял музея — мемарыяльны комплекс партызанскай славы «Хаваншчына» — рыхтуе рэканструкцыю падзей вайны, рэканструктары пакажуць партызанскую школу ў скверы Перамогі. Дарэчы, перад Домам культуры будзе ўстаноўлена скульптурная кампазіцыя, якая прадстаўляе хлопчыка і дзяўчынку з кнігай. Гэта падарунак гораду гільдыі кавалёў. Аўтары падкрэсліваюць, што ва ўсе часы, нават у такія лічыя, як вайна, калі страх вымушаў людзей пакінуць свае дамы, кніга была запатрабаваная, бо яна суправаджае чалавека ўсё яго жыццё.

Фота Святланы ЯСКЕВІЧ.

«Лятучыя кнігі».

НА ПАДМУРКУ ПАВАГІ ДА СПАДЧЫНЫ, ДА РОДНАГА СЛОВА

Начальнік аддзела культуры райвыканкама Ірына ЧАЛЫК расказала, што да ўдзелу ў святе рыхтуюцца ўсе ўстановы культуры раёна. Чаго варты адзін толькі гастранамічны фэст: дзе яшчэ можна пакаштаваць жытнія праснакі з крапівой?! Гэтую страву гатовы прадставіць музей «Хаваншчына». А яшчэ партызанская гарбата з шасці траў, сухарыкі івацэвіцкія, пернікі з сухафруктамі і шмат чаго іншага, што можна пакаштаваць толькі ў Івацэвіцкім раёне. Да таго ж пяць мясцовых гаспадынь прадэманструюць сваю аўтарскую кухню.

На фестывалі народнай творчасці і фальклору можна будзе пачуць і ўбачыць творчых людзей з самых розных вёсак раёна. Яны пакажуць песні, танцы, элементы абрадаў, строі — усё, чым багаты кожны куток раёна. Больш за два дзясяткі майстроў раёна возьмуць удзел у лакацыі «Горад майстроў». Падрыхтаваны выцінанкі, вышыванкі, сувеніры з івацэвіцкімі матывамі.

— Мерапрыемстваў запланавана шмат, на любы густ, — адзначае Ірына Аляксандраўна. — Напрыклад, пра 100-годдзе беларускай кінематаграфіі будзе нагадваць кінатэатр пад адкрытым небам, гледачы змогуць убачыць стужкі айчынных аўтараў.

— У праграме рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі «Івацэвіцкія чытанні» прадугледжана пяць Івацэвіцкіх дакладчыкаў, — паведаміла **начальнік аддзела ідэалагічнай работы і па справах моладзі Юлія СЯЎКО**. — Адзін з нашых краязнаўцаў раскажа пра нашчадка Пушкіна, ураджэнца Івацэвіччыны; будуць цікавыя паведамленні пра іншых землякоў, пра літаратурныя мясціны і падзеі раёна.

Мы рады, бо маем што паказаць гасцям. Напрыклад, у скверы Перамогі, дзе адбудзецца адно з мерапрыемстваў свята, сёлета з'явілася Алея памяці. Мы сабралі з усяго раёна здымкі франтавікоў — тых, хто вярнуўся і не вярнуўся з вайны, усіх, хто зрабіў унёсак у Вялікую Перамогу. І сёння кожны нашчадак удзельніка вайны можа знайсці здымак продка. Рэалізацыя гэтага праекта аб'яднала многіх людзей. Спадзяюся, што і падрыхтоўка да Дня беларускага пісьменства паслужыць справе адзінства на падмурку павагі да роднага слова, да кнігі, да нашай спадчыны.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Тыя, хто побач

СЛОВЫ — ЯК НАЙЛЕПШАЯ ЎЗНАГАРОДА НАСТАЎНІКУ

...Гады́, калі іх шмат, і сапраўды гады́.
Цяпер з Верай Піліпаўнай Вяргейчык мы сустракаемся рэдка, найчасцей размаўляем па тэлефоне: калі — з нагоды нейкіх свят, а калі і без. Мне прыемна чуць яе спакойны разважлівы голас, яе сардэчнае: «А добра было б убачыцца, пакуль мы тут...»
Нам абедзвюм ужо трошкі за 80, мы — так званыя дзеці вайны, удовы, з адных педагагічных падмосткаў, з мноствам агульных знаёмых... Так што тэм для размоў — проста не вычарпаць.

І вось я ў амаль што родным для Веры Піліпаўны Трасцянцы.

Вёска сустракае бязлюднай пустатой ды новымі дамамі дачнікаў, сяліба Вяргейчыкаў — утульнасцю і парадкам, што, напэўна, і не дзіва.

Гаспадыня Вера Піліпаўна — з вялікай працавітай сям'і. Усіх дзяцей там нарадзілася 11, вайну перажылі сямёра. Усіх трэ было нечым пакарміць, у нешта апрануць і абуць. Да восеньскіх маразоў дзеці хадзілі босымі. Толькі потым, ужо зазімкам, той самай Веры бацькі маглі купіць (калі ад старэйшых не засталіся) новыя кірзавыя боты, у якіх яна хадзіла і дома, і ў школу. Пра нейкі іншы абутак нават размовы не ішлі, бо не было грошай. Бацькам за работу ў калгасе амаль нічога не плацілі, падаткі спаганялі...

Выжывала сям'я за кошт сваіх мазалёў, сваёй гаспадаркі: агарод, карова, свінні, авечкі, куры... Усё гэта ў асноўным было пад наглядам Веры — перадапошняй у сям'і, бо старэйшыя дзеці, скончыўшы сем класаў, адразу з'язджалі.

З'ехала і яна: пасля заканчэння Межаўскай сямігодкі паступіла ў Аршанскае індустрыяльна-педагагічнае вучылішча на факультэт пачатковых класаў, паспяхова, з павышанай стыпендыяй адвучылася і вярнулася ў свой раён — прыйшла працаваць у Капланецкую сярэднюю школу.

Да сёння Вера Піліпаўна помніць, як цёпла сустрэлі яе настаўнікі, з якой павагай дырэктар школы Уладзімір Іванавіч Анцыпаў вывучаў дыплом будучай каляжанкі.

...Пасялілі яе ў хаце адзінокай жанчыны, даверылі першы клас — 20 малых, якія лавілі кожнае слова маладой настаўніцы, сачылі за кожным рухам. «Я настолькі любіла Веру Піліпаўну, — успамінала яе былая вучаніца Вольга Старынская, — што не хацела са школы ісці дадому! І я ж такая не адна была... Да сёння ўспамінаю яе з удзячнасцю».

Падобныя словы, мусіць, — найлепшая ўзнагарода для кожнага настаўніка!

...Прыгадвае Вера Піліпаўна і першае працоўнае выпрабаванне — сустрэчу з інспектарам райана. «У школу іх тады прыехала чалавекі чатыры ці пяць. Адзін — высокі такі мужчына — сказаў, што хоча на ўрок да настаўніцы пачатковых класаў. У мяне ад страху ногі падкасіліся, але што тут будзеш рабіць?.. Прыйшоў той інспектар у клас, ледзь уладкаваўся за апошняй партай, дастаў паперу, нешта піша на ёй... А я ў той бок і паглядзець баюся — выкладаю тэму ўрока».

У канцы яго інспектар падышоў да спалоханай, збянтэжанай настаўніцы, прыязна ўсміхнуўся ёй і ціха прамовіў: «Не хвалюйцеся. Усё было добра».

З гэтых слоў пачалося знаёмства Мікалая Фаміча Вяргейчыка з Верай Піліпаўнай Карэнька. Ёй здавалася — мімалётнае, выпадковае, абсалютна бесперспектыўнае, бо хто ён, — прыгажун ды яшчэ і з пасадай! А ў яе дык нават адукацыі вышэйшай няма.

З усіх сіл старалася не трапляцца яму на вочы, пазбягаць сустрэч.

Ён — не сляпы — гэта ўбачыў і... напісаў ёй ліст. Яна адказала.

Перапіска — цёплая, даверлівая, шчырая (што цікава, на аддлегласці паміж адрасатамі ў 10 кіламетраў — прасцей, здавалася, пехатой прайсці) доўжылася... два гады, пасля якіх Мікалай Фаміч зрабіў прапанову — напісаў: «Я без цябе — не я, ты без мяне — не ты. А вось разам мы ўжо сям'я... Ты згодна?»

Дзяўчына ўсё яшчэ вагалася... Аж пакуль не пачула ад старэйшай сяброўкі, што ідэальных, бездакорных людзей проста не існуе. А для сумеснага жыцця дай бог знайсці чалавека, які цэніць цябе і ведае цану сабе... Калі трапіўся такі — лічы, пашчасціла.

Маладыя згулялі вяселле, сталі разам працаваць у Паложынскай сярэдняй школе (муж — дырэктарам), гадаваць дачушак, паралельна будаваць свой дом у Трасцянцы...

У ім — вялікім і прасторным — Вера Піліпаўна ўжо дзесяць гадоў як жыве адна. Дзеці клікалі да сябе, але пераязджаць яна пакуль не збіраецца. «У гасцях, — кажа, — добра, а дома я сама сабе гаспадыня. Як хачу, так і жыву. Нікому не замінаю. Яшчэ і дапамагу, чым магу... Дзеці любяць сюды прыязджаць. Я сустракаю іх, прымаю. І ім добра, і мне».

Жыццё, згадзіцеся, вартае павагі.

Ніна Бурко.

Бярэзінскі раён.

Ёсць пытанне

КАЛІ БАЦЬКІ НЕ СУПРАЦЬ

Пад канец жніўня мы з мужам плануем з'ездзіць да сваякоў у Санкт-Пецярбург. Хацелася б узяць з сабою ўнучку (ёй восем гадоў)... Падкажыце, як яе бацькам афарміць дазвол на выезд за мяжу? Ці дастаткова згоды некага аднаго — напрыклад, маці?

Пісьмовая згода бацькоў на часовы выезд дзіцяці за межы Рэспублікі Беларусь можа быць засведчана ў любога натарыуса. Звярнуцца да яго трэба асабіста з дакументам, які сведчыць асобу, і дакументам, які пацвярджае роднасныя адносіны з дзіцем.

Факт роднасных адносін бацькоў і непаўналетняга можна праверыць па пасведчанні аб нараджэнні, па даведцы, якая змяшчае звесткі з запісу акта аб нараджэнні, па адзнаках у дакументах, якія пацвярджаюць асобу.

Агульныя правілы выезду з Рэспублікі Беларусь непаўналетніх грамадзян установлены артыкулам 12 Закона Рэспублікі Беларусь ад 20 верасня 2009 г. № 49-З «Аб парадку выезду з Рэспублікі Беларусь і ўезду ў Рэспубліку Беларусь грамадзян Рэспублікі Беларусь». Згодна з ім, непаўналетнія могуць выязджаць з Рэспублікі Беларусь па сваіх дакументах для выезду з Рэспублікі Беларусь і ўезду ў Рэспубліку Беларусь без суправаджэння законных прадстаўнікоў пры прад'яўленні пісьмовай згоды абодвух законных прадстаўнікоў.

Такім чынам, для выезду вашай унучкі спатрэбіцца пісьмовая згода і маці, і бацькі.

Па адпаведную згоду яны могуць звярнуцца як разам, адначасова, так і паасобку. Пры жаданні дакумент можна аформіць на любы тэрмін, у тым ліку да дасягнення дзіцем паўналетняга ўзросту, што выключыць неабходнасць штогадовага афармлення. Натарыяльны тарыф за пасведчанне згоды, за складанне і падрыхтоўку натарыусам праекта згоды не залежыць ад тэрміну яго дзеяння і складае 50 працэнтаў базавай велічыні.

Наталля Жукава,
натарыус Мінскай гарадской натарыяльнай акругі.

Весткі з месцаў

Прыйшоў Спас — і... лета ад нас

У беларусаў, як і ў кожнага народа, спрадвеку існаваў свой каляндар, з дапамогай якога з пакалення ў пакаленне перадаваліся веды, мудрасць, вопыт жыццёвых назіранняў. Крупінкі яго адбіваліся ў гульнях, песнях, звычаях і абрадах, у прыкметах, якія трэба зберагчы і перадаць нашчадкам.

Для гэтага майстрамі нашага аддзела рамёстваў і традыцыйнай культуры створаны адмысловы твор дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. У цэнтры яго, у аснове, знаходзіцца слуп з колам — сімвалам сонца, года, чарговасці з'яў у прыродзе і любімых свят. Сярод іх — Каляды, Вадохрышча, Гуканне вясны, Масленіца, Вербная нядзеля, Вялікдзень, Зялёныя святкі, Купалле, мядовы і яблычны Спасы, Дажынкі... Да кожнага з іх ад кола «спускаюцца» рознакаляровыя стужкі — прамяні.

Мэта экспазіцыі заключаецца ў тым, каб паказаць адметнасці святкавання, таго ці іншага перыяду календара.

Экспазіцыя «Кола свят» знаходзіцца ў аддзеле рамёстваў і традыцыйнай культуры Ашмян. Супрацоўнікі яго запрашаюць ахвотных наведаць установу і хоць на нейкі час апынуцца ў мінулым.

Вераніка Навіцкая,
г. Ашмяны.

Кропка на карце

ТУТ ЁСЦЬ КАМУ ЖЫЦЬ...

На месцы, дзе цяпер квітнее мая вёска Магільна, шмат вякоў таму неба падпіраў лес, прасціралася балота, працякала рака...
Хто ён, той першапраходзец, які на беразе наладзіў стаянку?
Адно зразумела: чалавек быў абачлівы. Ну яшчэ б: лес і рэчка — значыць, можна збіраць ягады-грыбы, лавіць рыбу — мець як мінімум работу і ежу.

А якое тут харастро! Лес падступае да самай вёскі. На вяршынях стромкіх кашлатых хвой часам начуюць аблокі, да дарог збягаюцца беластвольля бярозкі, серабром шапоча лістота асін, у вечным задуменні стаяць яліны.

Амаль побач — выток магутнага Нёмана, на беразе якога і месціцца вёска.

Сёння яна разраслася і ўдоўж, і ўпоперак. На новых вуліцах выраслі дыхтоўныя катэджы. Кругом чысціня і парадак. На вуліцах — асфальт, дамы патанаюць у садах і кветках.

Тут цэнтральная сядзіба гаспадаркі, а значыць, і «офісы» — СВК «Наднёман», сельскага Савета, тутэйшага лясніцтва. Тут — нашы магазіны і пошта, клуб, бібліятэка, узводзіцца прыгожая драўляная царква, адбудавана новая амбулаторыя і школа, дзе вучылі і вучаць дзяцей адданыя справе настаўнікі: Любоў Анатольеўна Собаль, Настасся Мікалаеўна Шкуратава, Алена Іванаўна Каладзінская...

Сярод іх вучняў — рабочыя і калгаснікі, інжынеры, урачы, людзі іншых прафесій.

Каб расказаць пра ўсіх, паважаных і заслужаных з нашай вёскі, не хопіць ніякай паперы... Узяць хоць бы ардэнаносца Мікалая Адамавіча Пармона (светлай памяці!), былога старшыню гаспадаркі. У час яго кіравання калгас быў у ліку самых перадавых, атрымліваў і высокія надоі, і добрыя ўраджаі, хоць каровы тады даіліся ўручную, ды і тэхніка была зусім не такой, як цяпер.

...З часам мяняецца многае: на змену старэйшым пакаленням прыходзяць маладыя. Дзякуй богу, ёсць каму жыць і працаваць на гэтай зямлі, бачыць і цаніць яе харастро, помніць тых, хто рабіў гэта раней, хто будзе рабіць потым.

Галіна Нічыпаровіч,
Уздзенскі раён.

Памяць

БЫЎ НА ПАЛЕССІ СВОЙ МАРАТ КАЗЕЙ

Сям'я Аляксея Міхайлавіча Калянковіча з вёскі Лахаўкі (цяпер Лунінецкага раёна) была невялікай: сам, жонка Ганна, дачка Таццяна і сын Іван. Да вайны гаспадар працаваў участковым міліцыянерам, жонка і дзеці займаліся гаспадаркай.

«Брат Ваня рос працавітым і цікаўным, — распавядала яго сястра Таццяна Ермалінская. — Перад вайной яму было 12 гадоў, але ён працаваў за дарослага мужчыну, шмат чытаў (яшчэ і ведаў на памяць вершы многіх паэтаў), мог разабраць і сабраць веласіпед, радыёпрыёмнік... Вайна заспела нашага бацьку ў Мінску. Адтуль ён даслаў вестачку, што з навучэнцаў міліцэйскіх курсаў фарміруюць апалчэнне. Больш пра яго мы нічога не ведаем. Сям'я заставалася на акупаванай тэрыторыі, потым падалася ў лес у партызаны. Івана залічылі ў разведчыкі».

...Летам 1944-га ў атрад паступілі звесткі, што ў вяскоўцаў з Краснай Волі паліцаі будуць адбіраць кароў. Хлопчыкаў паслалі ў разведку. Старэйшаму з іх, Васілю Глушню, далі карабін і патроны, Івану — гранату. З імі быў яшчэ адзін хлопчык-навічок...

Дабраўшыся да вёскі, разведчыкі высветлілі, што статак у бок Вулькі-2 гоняць тры паліцаі, падумалі, калі абстраляць іх, — каровы разбягуцца па дамах.

Гэты план, напэўна, спрацаваў бы, але паліцаяў аказалася больш, яны ехалі на возе ззаду. Васіль аднаго параніў, і быў застрэлены сам. Іван з сябрам сталі ўцякаць... Паліцаі, ведаючы мясцовасць, іх акружылі.

...Пазней, на судзе, адзін з тых здраднікаў і расказаў, як загінуў старэйшы хлопчык, як узялі ў круг малодшых і сталі набліжацца. Хлопчыкі стаялі абняўшыся, а калі першыя з ворагаў апынуліся зусім блізка, рванулі гранату.

Разведчыкі загінулі самі. Разам з імі загінуў адзін паліцай, другі быў цяжка паранены. Каровы вярнуліся да сваіх гаспадароў...

Удзячныя вяскоўцы праз некалькі дзён пахавалі юных партызан на Краснавольскіх могілках.

...Найбліжэйшыя родныя Івана (маці і сястра) адразу пасля вайны пераехалі ў Крым. Імя Івана Калянковіча, хлопчыка, які паўтарыў подзвіг Марата Казея, носіць піянерская дружына нашай мясцовай сярэдняй школы.

Сцяпан Нефідовіч,
аг. Любань, Лунінецкі раён.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
14 жніўня 2024 г. № 30 (763)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

«Калі апускаюцца рукі, гэта тое месца, куды трэба прыязджаць і прасіць дапамогі»

На прыём да Старшыні Савета Рэспублікі людзі едуць з усёй краіны

Фота БелТА.

«У мяне ёсць інфармацыя, што пасля візіту да Наталлі Іванаўны пытанне было вырашана нават не на 100, а на 150 працэнтаў, і проста імгненна. І такіх выпадкаў, наколькі я ведаю, вельмі шмат», — падзялілася з журналістамі жанчына, якая прыехала на асабісты прыём грамадзян да Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі КАЧАНАВАЙ па дапамогу. Асабістыя прыёмы дазваляюць людзям, якія трапілі ў цяжкую жыццёвую сітуацыю, вырашыць сваю праблему ці як мінімум атрымаць каштоўную параду. Прадстаўнікам улады падобныя мерапрыемствы дазваляюць убачыць, дзе ў заканадаўстве ці іншых нарматыўна-прававых актах ёсць недахопы і на што трэба звярнуць пільную ўвагу.

Чаму дальнабойшчык — «беспрацоўны»?

Паказальны прыклад Ніны Аляксандраўны з Бабруйска. Яна ўжо амаль пяць гадоў не можа спагнаць аліменты з былога мужа. Мужчына працуе ў Літве, мае заробак, але ў Беларусі лічыцца беспрацоўным і аліменты на дзіця выплачвае як беспрацоўны. Прычым гэта не адзінкавы выпадак. Па словах жанчыны, у Бабруйску нямала маці з такой жа праблемай. «Справіцца сваімі сіламі і сіламі судовага выканаўцы ў мяне не атрымалася, таму я звярнулася па дапамогу да Наталлі Іванаўны. Дзякуй ёй вялікі, я была прынята, выслухана, пачута. На жаль, мая праблема — гэта класічны фармат, у Бабруйску такіх, як я, вельмі шмат. Чамусьці ўсе нашы дальнабойшчыкі, развёўшыся, аказваюцца беспрацоўнымі і плацяць на дзіця 50 % пражытачнага мінімуму, хоць іх рэальныя даходы нашмат большыя. У мінулым месяцы я атрымала ад былога мужа 200 беларускіх рублёў. А з 2017 года атрымлівалася, што месяц плаціць, месяц не плаціць. І мы не ведаем, што з гэтым рабіць», — расказала жанчына. Старшыня Савета Рэспублікі даручыла ўзяць гэтае пытанне на асаблівы кантроль, звязацца з міністрам унутраных спраў, а таксама з міністрам працы і сацыяльнай абароны для прававога вырашэння гэтай сітуацыі. «Гэтую гісторыю я бяру на кантроль і цяпер буду яе каментаваць усюды. Чалавек лічыцца беспрацоўным, знаходзіцца на сацыяльным забеспячэнні, яго сям'я карыстаецца ўсімі сацыяльнымі дабротамі ў Беларусі. А ён насамрэч тым часам працуе за межамі краіны. Так быць не павінна», — адзначыла Наталля Качанава.

Дача — гэта не катэдж

На ўсе прыёмы грамадзян у Савет Рэспублікі запрашаюцца прадстаўнікі адпаведных ведамстваў і арганізацый. Гэта робіцца для таго, каб людзей, якія прыязджаюць за сотні кіламетраў, не проста выслухалі, а адразу далі парады, кансультацыі і ўзялі на кантроль. Напрыклад, Вольга Валер'еўна — шматдзетная маці, не можа атрымаць субсідыю на будаўніцтва жылля ў поўным аб'ёме, паколькі ў спадчыннай маёмасці ў яе ёсць дача. Але гэты дом знаходзіцца ў глухой вёсцы, дзе зусім няма ўмоў для пастаяннага жыцця, няма дзіцячага садка, школы, магазіна. Аднак яго ўлічваюць як жылы. «Законы на сёння менавіта такія. Але мясцовым уладам неабходна выходзіць з існуючых рэалій. Адна справа — катэдж у шматдзетнай сям'і ў Тарасаве. Іншая справа — вось такія сітуацыі, як у заяўніцы. Я катэгарычна не згодна з такім раўнаваннем. Даручаць вырашэнне такіх пытанняў трэба мясцовай уладзе: разбірацца выходзячы з існуючых рэалій і па сутнасці», — адзначыла Наталля Качанава. Яна ўзяла гэтую сітуацыю на кантроль.

«Візітам я вельмі задаволена. Наталлі Іванаўне вялікі дзякуй: усё расклала па палічках, растлумачыла, паведаміла, што закон ужо ў распрацоўцы і ў найбліжэйшы час сітуацыя павінна вырашацца ў лепшы бок. Таму спадзяёмся, што ўсё будзе добра. Яна мяне зразумела — як жанчына, як кіраўнік. Дзякуй ёй вялікі!» — падзялілася з журналістамі Вольга Валер'еўна.

Асаблівыя дзеці — асаблівыя праблемы

На прыём да Старшыні Савета Рэспублікі часта прыходзяць людзі, якім больш няма да каго звярнуцца. Таму і адлегласць для іх не перашкода. Крысціна Анатолеўна прыехала з Жабінкі. Жанчына адна выхоўвае 7-гадовага сына-інваліда з трэцяй ступенню страты здароўя — аўтызмам. Бацька ў хлопчыка ёсць, але ён пазбаўлены бацькоўскіх правоў. Жанчына расказала, што родных у яе няма і разлічваць яна можа толькі на сябе.

(Заканчэнне на 8-й стар.)

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

Жніво, дабрачыннасць, маніторынг цэн...

У сенатараў у рэгіёнах работы, як заўжды, хапае

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, упаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы ў Брэсцкай вобласці Міхаіл РУСЫ павіншаваў хлебаробаў Баранавіцкага раёна, якім першым пакарыўся статысячны рубеж, з новымі дасягненнямі. Ушанаванне прайшло на адным з палёў гаспадаркі — лідара цяперашняга жніва — ААТ «Крошын». Упаўнаважаны паразмаўляў з рэкардсменамі жніва аб асаблівасцях уборачнай кампаніі 2024 года.

Тэхналогіі нарыхтоўкі кармоў былі прадметам вывучэння парламентарыя ў ходзе азнаямлення з работай ААТ «Любашава» Ганцавіцкага раёна.

Наведваючы гандлёвыя сеткі дадзенай мясцовасці, Міхаіл Русы акцэнтаваў увагу на наяўнасці школьных прылад на вёсцы. На кантролі сенатара — цэны, шырыня і дастатковасць асартыментнага пераліку школьных прылад.

***

Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, генеральны дырэктар дзяржаўнай установы «Цэнтр культуры «Віцебск» Глеб ЛАПІЦКІ сустрэўся з дзецьмі з Данецкай Народнай Рэспублікі, якія прыбылі ў Віцебскую вобласць на аздараўленне.

Цэнтр культуры «Віцебск» падрыхтаваў для 43 хлопчыкаў і дзяўчынак насычаную экскурсійную і забаўляльную праграму.

Арганізавана наведванне выставачнай залы «Духаўскі круглік». Дзеці азнаёміліся з гісторыяй старажытнага горада на Дзвіне, Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску», наведалі галоўную пляцоўку фестывалю — Летні амфітэатр. Кожны змог адчуць сябе сапраўдным артыстам і паказаць свае таленты на вялікай сцэне.

Пасля экскурсіі гасцей горада чакала забаўляльная праграма на тэрыторыі комплексу культурна-масавага адпачынку імя Савецкай Арміі. У парку дзеці пракаціліся на розных атракцыёнах, пагулялі ў рухомыя гульні і, вядома ж, атрымалі масу станоўчых эмоцый.

***

Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, старшыня Гомельскай абласной арганізацыі рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа» Ала СМАЛЯК правяла ў Гомелі чарговы маніторынг цэн і асартыменту школьнай формы ў гандлёвых аб'ектах абласнога цэнтра.

Сенатар дэталёва азнаёмілася з асартыментам і цэнамі ва ўнівермагу «Гомель». «Прадстаўлены ў дадзеным гандлёвым аб'екце і іншых пунктах асартымент школьнага адзення, абутку, ранцаў, канцылярскіх прылад, іншых неабходных для навучэнцаў тавараў — на любы густ, на любы запыт», — падкрэсліла Ала Смаляк, адзначыўшы, што ў магазіне шырока прадстаўлены беларускія прадпрыемствы.

Гаворачы аб цэнах на тавары для школьнага сезона, сенатар зрабіла акцэнт: яны на пастаянным кантролі. «Падчас маніторынгаў гомельскіх гандлёвых пунктаў выпадкаў неабгрунтаванага завышэння цэн выяўлена не было. Тэма працягвае заставацца ў цэнтры ўвагі. Важна не дапусціць неабгрунтаванага павышэння цэн, каб падрыхтоўка да школы і далей ішла ў размераным рытме. І каб усе нашы дзеці пачатак навучальнага года сустрэлі ў поўным узбраенні, з добрым настроем», — сказала яна.

Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі.

«Калі апускаюцца рукі, гэта тое месца, куды трэба прыязджаць і прасіць дапамогі»

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)

Сям'і няма дзе жыць, і жанчына з сынам спынілася ў сяброўкі. Наталля Качанава даручыла знайсці сям'і зручнае жыллё, узяла сітуацыю на кантроль і запэўніла, што пастараецца максімальна дапамагчы ў гэтай сітуацыі. «Калі апускаюцца рукі і больш няма куды звярнацца, то, мабыць, гэта менавіта тое месца, куды трэба прыязджаць і прасіць дапамогі. Гэта была мая самая вялікая надзея. Калі я казала сабе, што я так больш не магу, Наталля Іванаўна мяне натхняла на тое, што ёсць выхад», — пасля прыёму Крысціна Анатольеўна не хавала эмоцый.

Фота Belta.

Па дапамогу да Старшыні Савета Рэспублікі звярнуўся і Сяргей Іванавіч з Мінска. Пасля смерці жонкі мужчына адзін выхоўвае сына-інваліда першай группы (аўтызм). Хлопцу трэба адпачываць, аздараўлівацца. Але з такім дыягназам ў санаторый не накіроўваюць. «Нам трэба падумаць аб стварэнні санаторыя для аўтыстаў, старэйшых за 18 гадоў, і асоб, якія пакутуюць ад іншых захворванняў. Гэта трэба нават для бацькоў, якія іх даглядаюць, каб даць ім магчымасць адпачыць», — заўважыла Наталля Качанава. Гэта пытанне яна таксама ўзяла на свой кантроль.

«Вельмі прыемная сустрэча, прыемна прайшла гутарка. Вельмі тонкія, душэўныя людзі, выслухалі з разуменнем. Я думаю, што ўсё будзе добра. Дай Бог ім усім здароўя, доўгіх гадоў. Каб у іх сямейны дабрабыт быў і ўсё было добра. Наша кіраўніцтва сапраўды выклікае захапленні», — падзяліўся ўражаннямі Сяргей Іванавіч.

Галіна Віктараўна з Мінска перадала Наталлі Іванаўне калектыўны зварот бацькоў дзяцей-інвалідаў. Яны просяць даць роўныя магчымасці ў адукацыйным працэсе дзецям-інвалідам з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, у прыватнасці арганізацыі персанальнага суправаджэння дзяцей з сіндромам Даўна падчас навучальнага працэсу. Пры Савеце Рэспублікі дзейнічае кансультатыўны савет па пытаннях сацыяльнай адаптацыі і інтэграцыі дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. У найбліжэйшы час адбудзецца чарговае пасяджэнне гэтага савета. Наталля Качанава даручыла падрыхтаваць у Савеце Рэспублікі сустрэчу з ініцыятыўнай групай бацькоў, якія выхоўваюць дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

* * *

Усе пытанні, з якімі людзі з розных гарадоў прыехалі на асабісты прыём да Старшыні Савета Рэспублікі, узяты на кантроль, адказным асобам дадзены адпаведныя даручэнні. І не толькі на словах, а на справе, паколькі работа са зваротамі грамадзян з'яўляецца адным з асноўных кірункаў дзейнасці Савета Рэспублікі. З красавіка да ліпеня бягучага года сенатарамі праведзена 186 асабістых прыёмаў, 92 прамыя тэлефонныя лініі. Разгледжана звыш 1960 зваротаў. За кожным з іх — гісторыі людзей, якія трапілі ў складаную жыццёвую сітуацыю. Таму, як неаднаразова падкрэслівала Наталля Качанава, трэба ўважліва разглядаць кожную канкрэтную сітуацыю і прыкладаць максімум намаганняў, каб дапамагчы чалавеку.

Валерыя СЦЯЦКО.

«За пытаннем аднаго чалавека могуць стаяць праблемы вуліцы...»

Леанід Заяц выслухаў звароты грамадзян у Асіповічах

Афармленне спадчыны, просьба вярнуць адменены рэйс электрычкі, дапамагчы разабрацца ў пытаннях са спадчынай — гэтыя і іншыя пытанні сталі прадметам разгляду падчас прыёму грамадзян старшынёй Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Леанідам ЗАЙЦАМ у Асіповічах.

Былы афганец з мностваам узнагарод на камуфляжы прыйшоў пахадайнічаць за сваіх таварышаў, якія зведалі жах вайны ў гарачай кропцы. Ён сказаў, што наступствы гэтага не праходзяць дарэмна. Многія з тых, хто ваяваў, атрымалі раны і заўчасна пайшлі з жыцця. Мужчына просіць унесці ў законапраект «Аб змяненні законаў па пытаннях ветэранаў» некалькі дапаўненняў. У прыватнасці, каб у былых афганцаў была магчымасць выходзіць на пенсію датэрмінова — у 60 гадоў — і каб ветэранаў гэтай вайны далучылі да льготнай катэгорыі. «З Афганістана выйшла 22 тысячы чалавек, цяпер, напэўна, засталося менш за палову, — сказаў заяўнік. — Мне 75 гадоў, і я спрабую прыносіць карысць грамадству. Як і мае таварышы». Леанід Заяц адзначыў, што пытанне аб ільготах вельмі правільнае і ён яго падтрымлівае. «Моладзі трэба ў вас вучыцца, як служыць Радзіме», — сказаў сенатар.

Жыхарка райцэнтра паскардзілася на тое, што не выконваецца графік вывазу смецця. «На нашу пляцоўку зносяць адходы жыхары трох жылых дамоў, інтэрната і прыватнага сектара. Адным рэйсам гэта немагчыма вывезці, але камунальнікі заяўляюць, што ў іх то паліва няма, то з машынамі дрэнна. У выніку смецце ўвесь час на пляцоўцы», — падзялілася праблемай жанчына. Яна таксама наракала на дарожку, якой карыстаюцца жыхары і якую падчас

дажджоў залівае так, што па ёй не прайсці.

Леанід Заяц пацікавіўся ў дырэктара Асіповіцкага УКП ЖКГ Дзмітрыя Кулакоўскага, які прысутнічаў на прыёме, у чым праблема. Той заўважыў, што смецце назапашваецца з-за таго, што жыхары прыватнага сектара нелегальна карыстаюцца пляцоўкай. Сенатар параіў пагутарыць з людзьмі і адрэгуляваць пытанне.

Яшчэ ў адной жыхаркі Асіповіч узніклі пытанні з афармленнем спадчыны і прыватызацыяй кватэры на льготных умовах. У яе таксама прэтэнзіі да сусядзяў, якія, па яе словах, заліваюць ёй участак. Пытанні ўзяты на кантроль і будуць адрэгуляваны, паабяцаў Леанід Заяц.

Адменены рэйс электрацягніка Мінск — Асіповічы стаў прычынай калектыўнага звароту жыхароў вёсак Верайцы, Верхі, Перарожкі, Дражня і Дубовае. Яны жадаюць, каб рэйс быў адноўлены. «У нашых вёсках жыве 454 чалавекі, — паведамілі яны. — Рэйс быў адменены па будніх днях з сакавіка 2022 года. І цяпер мы не можам выехаць са сваіх вёсак да самага вечара. А за таксі ў два бакі трэба плаціць 30 рублёў».

Леанід Заяц заўважыў, што адсутнасць магчымасці даехаць, куды трэба, — гэта праблема. І варта зрабіць усё, каб людзі не былі пакрыўджаныя.

З Мінска на прыём да сенатара прыехаў малады чалавек, які за вялікія грошы набыў ўчастак у пасёлку Калядзічы. Пры продажы было заяўлена, што там ёсць усе камунікацыі, насамрэч нічога не было, і пакупнік усё рабіў за свой кошт. Калі падвёў электрычнасць да дома, высветлілася, што магутнасці, якой забяспечваюць мясцовыя РЭС, недастаткова. Мужчына звяртаўся і да энергетыкаў, і да мясцовай улады, але безвынікова. Маўляў, рэканструкцыя запланавана на 2037 год. І толькі пасля зваротаў у Савет Рэспублікі высветлілася, што для таго, каб вырашыць праблему, трэба замяніць усяго 100—150 метраў кабелю. Гэта дасць магчымасць павысіць магутнасць не толькі для аднаго чалавека, але і для ўсіх спажыўцоў электрычнасці па вуліцы Лазурнай. Жыхары згодны прыняць удзел у суфінансаванні праекта. Леанід Заяц паспачуваў маладому чалавеку і паабяцаў, што праблема будзе вырашана. Заяўнік прызнаўся, што дастукацца да Савета Рэспублікі яму было прасцей, чым да мясцовай улады.

У членаў садаводчага таварыства «Крыніца-Крываполле», якія таксама прыехалі на прыём грамадзян з Мінска, быў цэлы шэраг прэтэнзій да кіраўніцтва СТ. Яны паведамілі пра мноства парушэнняў фінансава-гаспадарчай дзейнасці, непрыняцці мер па ўцягванні ў зямельны абарот участкаў, якія не выкарыстоўваюцца доўгі час. Акрамя гэтага, у адрас заяўнікаў, якія спрабуюць разабрацца з праблемамі і звяртаюцца ў розныя інстанцыі, паступаюць пагрозы. Леанід Заяц паабяцаў разабрацца з пытаннем, у тым ліку пасадзейнічаць у арганізацыі праверкі фінансава-гаспадарчай дзейнасці таварыства. Ён перадаў заяўнікам сваю візітку і дазволіў тэлефанаваць наўпрост, калі будуць узнікаць складанасці пры вырашэнні праблем.

— У нас павінна быць кансалідацыя грамадства, не павінна быць ніякага разладу, — сказаў Леанід Заяц журналістам па заканчэнні прыёму грамадзян. — Калі ў чалавека праблема, ён звяртаецца ў органы дзяржкіравання, каб там дапамаглі яе вырашыць. Ці добра гэта, калі сусед падтапіў суседа і той пакрыўдзіўся? Значыць, трэба органам мясцовай улады пад'ехаць, памірыць гэтых грамадзян. Паіншаму не павінна быць у нашай краіне. Або калектыўны зварот ад жыхароў вёсак, дзе жывуць 454 чалавекі і ў якіх з панядзелка да чацвярга праблема выехаць. Ці нельга было гэта пытанне вырашыць на месцы? Можна. Трэба мясцовым органам улады, у тым ліку сельсавету — гэта яго хлеб — выканкаму паглыбляцца ў гэтыя пытанні, каб яны наогул не мелі месца. А калі маюць працяг, трэба разабрацца, чаму. Усе пытанні павінны быць вырашаны, трэба падыходзіць да праблемы па-чалавечы. У чалавека праблема наспела не сёння, не ўчора, трэба яго чуць. Калі перад пад'ездам гара смецця, а ЖКГ не звяртае ўвагі — гэта няправільна. Мы жывём у сваёй краіне, павінны клапаціцца пра чалавека, каб у нас сапраўды было маналітнае грамадства, каб мы свае імі дзеяннямі не стваралі раздрай. Правільна кажа Прэзідэнт: трэба звяртаць увагу на кожную просьбу ці пытанне нашых людзей, таму што за гэтым пытаннем стаяць, магчыма, праблемы ўсёй вуліцы. Вось прыйшоў чалавек з просьбай замяніць 100 метраў кабелю, а на той вуліцы яшчэ дзевяць дамоў, дзе, не выключана, жывуць пенсіянеры, людзі, якія працавалі на карысць краіны. Трэба здымаць гэтыя пытанні, трэба іх вырашаць.

Нэлі ЗІГУЛЯ,
фота аўтара.

«Па форму выбіраемся ў горад»

Як рыхтуюцца да школы шматдзетныя сем'і з сельскай мясцовасці

У адзін з першых дзён жніўня ў Савеце Рэспублікі адбылася нарада па пытаннях забеспячэння школьнай формай навучэнцаў у кантэксце падрыхтоўкі да новага навучальнага года. Разглядалі цэнавую палітыку, асартымент, і разам з тым на нарадзе падкрэслівалася, што мясцовыя органы ўлады не павінны стаяць убаку ад пытанняў падрыхтоўкі да школы асабліва ў сельскіх населеных пунктах. Карэспандэнт «МС» пацікавілася ў шматдзетных вясковых бацькоў, як яны рыхтуюцца да новага навучальнага года, на якую падтрымку разлічваюць і ці адчувальная для іх фінансавая дапамога дзяржавы.

Сям'я ШАВЯЛЁВЫХ.

Сям'я ЛІТВІНЮКОЎ.

За дзень прыбраць дваіх

Валянціна і Мікалай Літвінюкі з вёскі Войская Камянецкага раёна гадуюць дзевяцярых дзяцей. Шасцёра з іх ужо школьнікі.

— Да школы мы фактычна падрыхтаваныя, — гаворыць Валянціна Васілеўна. — Атрымалі дапамогу ад дзяржавы. Літаральна днямі грошы мне залічылі на картку. Але рыхтавацца да навучальнага года я пачынаю з пачатку лета. Бо ўсё адразу не купіш. У чэрвені звычайна купляю канцылярскія прылады: ручкі, партфелі, сшыткі, дзённікі, вучэбныя дапаможнікі, якія абавязкова спатрэбяцца. Адзенне і абутак мы набываем у жніўні, бо нехта са школьнікаў можа падрасці, выцягнуцца за лета. Купіш загадзя — можаш у верасні атрымаць праблему.

Для нашых дзяцей гэта падзея — паездка ў Брэст па школьную форму, — працягвае аповед шматдзетная маці. — Звычайна выбіраемся ў горад з двума школьнікамі, каб добра разгледзець, памераць рэчы. У нашай школе прадугледжаны дзелавы стыль адзення з абавязковай бардовай камізэлькай. Астатняе падбіраем у тон камізэльцы. Цяпер выбар школьнай формы дастаткова вялікі. Ёсць рэчы фактычна на любы кашалёк. Я аддаю перавагу пінскаму трыкатажу і некаторым іншым вытворцам. Абутак таксама купляем беларускі, скураны. На горкім вопыце ўпэўніліся, што купіць пару абутку са штучнага матэрыялу можа абысціся даражэй. Маю на ўвазе сітуацыю, калі дзіця не даносіць чаравікі да канца навучальнага года і давядзецца купляць новыя. А пару з натуральнай скуры купіш на 10-20 рублёў даражэй, школьнік сезон паходзіць, яшчэ і малодшаму брату застанецца, — падзялілася досведам маці вялікага сямейства.

Варта сказаць, што ўсе дзеці Літвінюкоў добра вучацца, займаюцца ў музычнай школе. Таму напярэдадні новага навучальнага года бацькі набываюць зручнае адзенне, якое падыдзе і для заняткаў у музычнай школе, а таксама сёе-тое, патрэбнае для спорту. Адным словам, паездку па пакупкі старающа зрабіць падзеяй. У гэтай сям'і заўсёды правядуць гутарку аб тым, як нялёгка зараблюцца грошы, як трэба берагчы рэчы, дапамагаць бацькам па гаспадарцы і адказна ставіцца да сваёй асноўнай працы — вучобы.

Старшыня Войскага сельскага Савета Віктар МІХАЙЛОЎСКІ сказаў, што сям'ю Літвінюкоў мясцовая ўлада заўсёды ставіць у прыклад іншым:

— А ўсяго ў 21 вёсцы сельсавета пражывае 33 шматдзетныя сям'і. У асноўным сем'і добрыя, і дзеці ў іх ужо падрыхтаваныя да школы. Праўда, ёсць на тэрыторыі некалькі сем'яў, якія патрабуюць павышанай увагі мясцовай улады і іншых зацікаўленых арганізацый. Напрыклад, у адной з вёсак жыве сям'я, у якой бацька выхоўвае траіх дзяцей адзін. У свой час ім далі пэўныя льготы як шматдзетным бацькам. Маці гэтага сямейства пайшла з жыцця не так даўно. Раней былі заўвагі і да бацькі, які нярэдка грашыў выпіўкай. Цяпер мы пастаянна трымаем сям'ю на кантролі. Нядаўна ў іх у доме памянялі электраправодку, бо самае першае — гэта пытанне бяспекі. Наведваем сям'ю разам з супрацоўнікамі сферы адукацыі, сацыяльнай службы і іншых устаноў. Гатовыя падключыцца, калі ўзнікнуць пытанні падрыхтоўкі да новага навучальнага года.

Істотная падтрымка ад прадпрыемства

Ірына і Сяргей Шавялёвы з вёскі Паляцічы Батчынскага сельсавета Кобрынскага раёна — бацькі траіх дзяцей. Варвара і Матвей ужо школьнікі. Іх сям'я кожнае лета абавязкова выбіраецца ў падарожжа па сваёй краіне альбо за яе межы, каб, як сказала Ірына, не толькі паляпшаць дабрабыт, але і назапашваць эмоцыі, успаміны. А пасля водпуску, як і ў кожнай сям'і, даводзіцца ўключаць рэжым эканоміі.

— І тады вельмі дарэчы дапамога дзяржавы, — гаворыць маці сямейства. — Мы ўжо атрымалі яе, зараз чакаем яшчэ адну. Мы з мужам працуем на прадпрыемстве «Кобрынскае ПМС». Паводле калектыўнага дагавора, як шматдзетная сям'я атрымліваем пэўную суму грошай і ад прадпрыемства, і ад прафсаюзнай арганізацыі на кожнае дзіця. Прычым атрымліваем кожны з нас як член працоўнага калектыву. І гэта вельмі істотны ўнёсак у падрыхтоўку нашых школьнікаў. Бо самі ведаеце, цяпер дзіцячыя рэчы каштуюць амаль як для дарослых. За дапамогу наша сям'я ўдзячная і дзяржаве, і нашаму прадпрыемству. Так што для бацькоў, якія ў роздуме аб колькасці дзяцей, наш прыклад, думаю, можа быць стымулам, — заключыла Ірына Шавялёва.

Старшыня Батчынскага сельскага Савета Святлана ГАНГАЛА сказала, што пакуль пытанняў па падрыхтоўцы да школы не ўзнікае. Цяпер гандлёвыя пункты знаходзяцца ў зоне доступу жыхароў нават малых вёсак. Хіба толькі форс-мажорныя абставіны ў якой-небудзь сям'і прымусяць падключацца мясцовую ўладу, але пакуль такіх абставін на тэрыторыі сельсавета не ўзнікала. Усе сем'і, у тым ліку шматдзетныя, набываюць неабходныя для новага навучальнага года форму, школьныя прыналежнасці. І сапраўды, для кожнай сям'і такі шопінг становіцца падзеяй, асабліва для тых сем'яў, дзе ёсць першакласнікі.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота з архіва герояў.

ФОРМА ПАД ЗАКАЗ

Карэспандэнт «МС» пацікавілася, як дэпутаты Магілёўшчыны ўдзельнічаюць у падрыхтоўцы школьнікаў да навучальнага года

Маніторыць гандлёвыя аб'екты на прадмет цаны, якасці і асартыменту школьнай формы і іншых тавараў да новага навучальнага года народныя выбраннікі Магілёўшчыны пачалі яшчэ ў канцы ліпеня. Сёння яны інспектуюць школьныя базары, вывучаюць пажаданні насельніцтва, аказваюць дапамогу маламаёмным сем'ям, дзе з падрыхтоўкай дзіцяці да школы ёсць складанасці.

Старшыня Крычаўскага райсавета дэпутатаў, кіраўнік раённага аддзялення беларускай партыі «Белая Русь» Ірына ПРУДНІКАВА наведала «Школьны базар» на мясцовым рынку на пачатку жніўня. Паглядзела асартымент, пагутарыла з прадпрымальнікамі, адзначыла слабыя моманты.

— Недастаткова была прадстаўлена прамысловая група тавараў, асабліва што датычыцца формы для старшакласнікаў, — паведаміла яна. — Форма беларускіх вытворцаў адсутнічала наогул, у некаторых прадаўцоў цэны на адзенне былі відавочна завышаныя. Зразумела, што кожны зацікаўлены ў прыбытку, але ж трэба ўлічваць і сацыяльны момант. Неабходна задаволіць попыт пакупнікоў на месцы, а не прымушаць іх ехаць у абласны цэнтр.

Суразмоўніца адзначыла таксама, што хоць рынак у Крычаве і працуе штодзённа, акрамя панядзелка, не ўсе паспяваюць яго наведаць, бо ён рана закрываецца. Таму дэпутат прапанавала адміністрацыі рынка на перыяд да пачатку вучэбнага года падоўжыць час работы «Школьнага базару».

Ёсць прапанова і наконт асартыменту. У Крычаве, напрыклад, навучэнцы розных школ практыкуюць дзелавы стыль, у якім павінны прысутнічаць элементы адналькавага колеру. У адной школе носяць бардовыя камізэлькі, у другой — джэмперы або пінжакі сіняга колеру. Гэты прабел маглі б вырашыць беларускія вытворцы, якія маюць калекцыі школьнага адзення з улікам пажаданняў Міністэрства адукацыі.

— Мы гэту праблему абмеркавалі з калегамі, — кажа старшыня райсавета. — Цяпер прапрацоўваем магчымасць запрасіць буйных вытворцаў ад «Беллегпрама» правесці ў Крычаве дзень выязнога гандлю. Пытанне разглядаецца на ўзроўні аддзела эканомікі райвыканкама, які, дарэчы, узначальвае наш дэпутат.

Старшыня Горацкага райсавета і раённага аддзялення рэспубліканскага аб'яднання «Белая Русь» Максім ПАТАПЕНКА адзначае, што ў раёне дзяцей у школу збіраюць, як той казаў, усім светам.

— Падключаем усіх і ўся, — удакладняе ён. — У працэс уцягнуты прадпрыемствы і арганізацыі, грамадскія аб'яднанні, сельскагаспадарчыя арганізацыі. Установы адукацыі падказваюць, каму трэба дапамагчы. Ад імя дэпутатаў і грамадскай арганізацыі «Белая Русь» дзесяці сем'ям з ліку шматдзетных дапаможам набыць усё неабходнае да школы. Па такім жа прынцыпе дзейнічаюць сельсаветы сумесна з сельгасарганізацыямі, якія знаходзяцца на іх тэрыторыі, і ўсе астатнія. Паўсюдна праводзяцца дабрачынныя акцыі.

Горацкае праўленне раённага спажывецкага таварыства, якім кіруе **дэпутат Горацкага райсавета Ірына КУСЦІКАВА**, нават зрабіла плакат для аўтакрам з надпісам «Хутка ў школу». Гэтыя аўтакрамы абслугоўваюць больш чым 100 населеных пунктаў. Разам з прадуктамі дастаўляюць прамысловыя тавары, у тым ліку школьнага прызначэння.

Фота з сайта kichevlive.by

— Сёння назіраецца попыт на канцылярскія тавары, яны ў нас у вялікім асартыменце, — кажа Ірына Кусцікава. — Што датычыцца школьнай формы, то пакуль заказаў на яе не паступала. Хоць усе ведаюць, што мы прывозім тавар па заяўках. У нас з усімі пастаўшчыкамі «Беллегпрама» заключаны дагаворы, і пакупнікі могуць замаўляць форму любога беларускага вытворцы цалкам або паасобку, той жа пінжак, штаны ці спадніцу.

У самім райцэнтры праблему дапамагаюць вырашаць сеткавікі. Ёсць фірменныя крамы ад вядучых беларускіх вытворцаў.

— Вяскоўцы прыязджаюць на выхадныя ў горад і закупляюцца па поўнай праграме, — кажа дэпутат. — Тут свае перавагі — і выбар ёсць, і прымераць можна. Напэўна, таму і заказаў у нас няма. Але мы гатовыя задаволіць пажаданні нашага пакупніка. Звычайна попыт на гэтую групу тавараў узрастае пасля 15 жніўня.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ДЗЕЛЯ МАЛОЙ РАДЗІМЫ

Хто марыць аднавіць былы сквер у гарадскім пасёлку Поразава Свіслацкага раёна

Неяк мясцовая жыхарка Валянціна БОТВІЧ задумалася: чаму б не заняцца добраўпарадкаванням тэрыторыі ў цэнтры свайго роднага пасёлка? З гэтай ідэяй яна звярнулася да старшыні Поразаўскага сельвыканкама Віктара АКУДОВІЧА. Агульнымі намаганнямі ідэя ў хуткім часе ўвасобілася ў праект з прыгожай назвай «Сквер маёй мары». Заяўку накіравалі ў конкурсную камісію асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў пры абласным Савеце дэпутатаў. Праект атрымаў станоўчую ацэнку і грант для рэалізацыі ідэі.

Сядзіба Багудзенкі і ўнікальны торт «банкуха» – славутасці Поразава, якія прыцягваюць турыстаў.

Сквер у Поразаве невялікі, але праявіць фантазію ёсць дзе.

Валянціна Ботвіч працуе ў мясцовай краме, яна карэнная жыхарка гарадскога пасёлка. Яе жыццёвае крэда простае: «Дзе нарадзіўся, там і спатрэбіўся». Але мала жыць як жывецца – трэба яшчэ і карысць нейкую людзям прыносіць. З такіх пазіцый і пачала яна сваю грамадскую дзейнасць.

– Ведаеце, гэта месца ў цэнтры пасёлка даўно прасіла ўвагі. Калісьці тут быў сквер, былі лаўкі, але з цягам часу яны зніклі, а гэты кавалак зямлі проста пусты. Праўда, нядаўна мы высадзілі там каля 20 дрэў, але гэтага мала. Патрэбна нейкая інфраструктура, бо ўчастак у самым цэнтры Поразава, праз яго ідзе актыўны рух. Хочацца, каб тут быў утульны куточак, – тлумачыць жанчына сваю зацікаўленасць.

Вядома, былы сквер не занядбаны. Тут праходзяць суботнікі, прыбіраецца тэрыторыя. Вось і дрэўцы маладыя пасадзілі. Але мясцовыя жыхары хочуць бачыць яго больш ажыўленым. Праект грамадзянскіх ініцыятыў якраз і накіраваны на гэта.

– У Поразаве пражывае каля 900 чалавек, у сельскім Савеце ў два разы больш. У нас нямала аб'ектаў, якія цікавыя турыстам. А сквер знаходзіцца якраз на шляху да многіх. Аб старажытнасці пасёлка гаворыць той факт, што ён згадваецца ў 1460 годзе. У Поразаве знаходзяцца два даволі старыя храмы, захаваўся будынак сінагогі, а сядзіба Багудзенкі з'яўляецца помнікам архітэктуры драўлянага дойлідства XIX стагоддзя, – прыгадвае гістарычнае мінулае свайго краю Валянціна Ботвіч.

Актывістка прыгадала і асаблівасці гэтых тэрыторый. Напрыклад, менавіта адсюль, з Поразава, пачаўся росквіт знакамітай дымчата-шэрай керамікі. У мясцовай бібліятэцы створаны музей, дзе захоўваюцца каштоўныя экспанаты поразаўскіх майстроў, сабрана цікавая інфармацыя аб развіцці ганчарнага рамяства на тэрыторыі сельскага Савета. Таксама тут вырабляецца Поразаўская банкуха – кандытарскі выраб, які ўнесены ў спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі.

Як правіла, праезд да славутасцяў навакольля ляжыць праз цэнтр гарадскога пасёлка. Тут праходзіць некалькі турыстычных маршрутаў, у тым ліку веласіпедных. Валянціна лічыць, што адноўлены сквер стане яшчэ і месцам невялікага перапынку для велатурыстаў, але не толькі. Мяркуецца, што тут змогуць спыніцца і сем'і з дзецьмі. Напрыклад, падчас наведвання гандлёвых цэнтраў і храмаў. Для зручнасці ў скверы будзе ўстаноўлена адпаведная інфраструктура. Для дзетак – гульнявы комплекс, для турыстаў – стаянка для веласіпедаў, для тых, хто хоча проста адпачыць, – некалькі стыльных лавак і альтанка. Прадугледжаны і сметніцы. Паколькі сквер знаходзіцца каля праезнай часткі, у мерах бяспекі плануецца ўстанавіць агароджу фармату 3D. Каля ўвахода будзе размешчаны інфармацыйны стэнд з картай-схемай маршрутаў і пазначаны славутыя аб'екты Поразаўскага краю.

– Плошча сквера невялікая, таму вырашылі спыніцца на самых актуальных аб'ектах інфраструктуры і неяк ўкласціся ў каштарыс. Згодна з праектам, нам выдзелена 24 тысячы рублёў, яшчэ некалькі тысяч мы атрымалі ад нашых спонсараў – СВК імя Дзеншчыкова і прыватных прадпрыемстваў. Не засталіся ў баку ад добрай справы нашы прыходы – каталіцкі і праваслаўны. Свой унёсак зрабілі мясцовыя жыхары, якія таксама хочуць бачыць нашу малую радзіму дагледжанай і ўтульнай, – расказвае Валянціна Ботвіч. Яна ўпэўнена, што з аднаўленнем цэнтральнага сквера пасёлак яшчэ больш ажыве.

Праект «Сквер маёй мары» можна лічыць першым праектам Поразаўскага сельскага Савета, які атрымаў фінансавую падтрымку ў рамках абласнога конкурсу грамадзянскіх ініцыятыў. Між тым вопыт праектнай дзейнасці тут ёсць. У рамках міжнароднай праграмы рэалізаваны праект «Другое жыццё векавога парку». Па словах старшыні Поразаўскага сельвыканкама Віктара Акудовіча, была прыцягнута значная сума на аднаўленне і добраўпарадкаванне паркавай зоны. Устаноўлена агароджа, канцэртная сцэна для правядзення масавых мерапрыемстваў. З'явілася месца для размяшчэння гандлёвых павільёнаў, устаноўлены лаўкі, альтанкі, пракладзены дарожкі. Цяпер гэта любімае месца адпачынку мясцовых жыхароў і гасцей гарадскога пасёлка.

У планах старшыні сельсавета працягваць праектную дзейнасць. Ён расказаў, што мае задумку прапанаваць на конкурс ініцыятыў праект па захаванні гістарычнай памяці па выніках пошукавай работы. На тэрыторыі сельскага Савета амаль штогод вядуцца раскопкі, звязаныя з пахаваннямі перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Па словах старшыні сельвыканкама, сабраны даволі багаты матэрыял, які можа стаць экспазіцыяй музейнага пакоя. Размясціць экспанаты плануецца ў будынку сельвыканкама, які нядаўна перададзены мясцовай уладзе. Укладанні, па словах Віктара Акудовіча, невялікія – зрабіць рамонт і паставіць стэлажы. «Праекты грамадзянскіх ініцыятыў, якія цяпер актыўна рэалізоўваюцца асацыяцыяй мясцовых Саветаў пры Гродзенскім абласным Савеце дэпутатаў, дазваляюць прыцягваць шырокае кола мясцовых жыхароў, прадпрыемстваў і арганізацый ў развіццё тэрыторый, садзейнічаюць турыстычнаму патэнцыялу і фарміраванню спрыяльнага асяроддзя», – заўважыў старшыня сельвыканкама. Да таго ж такія праекты дапамагаюць яшчэ і раскрыцца людзям, якія маюць трывалую грамадзянскую пазіцыю і хочуць накіраваць свае сілы на карысць малой радзімы.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

У тэму

Днямі адбылося падвядзенне вынікаў чарговага, трэцяга па ліку, конкурсу грамадзянскіх ініцыятыў, арганізаванага Гродзенскай абласной асацыяцыяй мясцовых Саветаў пры падтрымцы абласнога Савета дэпутатаў.

Пераможцамі сталі дабрачынная арганізацыя Цэнтр дапамогі «Вера», якая займаецца работай у рамках інклюзіўнай дзейнасці. Праектам прадугледжана стварэнне гульнявой і трэнажорнай інфраструктуры на тэрыторыі цэнтра. Другі праект-пераможца – «Масты-арэна – 2». У яго рамках будзе зроблены навес на сцэнічнай пляцоўцы, дзе сёлета пройдуць абласныя «Дажынкі». Трэцяя ініцыятыва будзе рэалізавана ў аграгарадку Навасёлкі Слонімскага раёна. Тут плануецца абсталяваць пляцоўку для правядзення свят і фестываляў, у тым ліку брэндавага фэсту «Паўлаўскі каравай», абрад выпечкі якога ўнесены ў спіс нематэрыяльнай спадчыны Беларусі.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 3820000007667 ад 03.04.2004. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 10.896. Нумар падпісаны ў 19.30 13 жніўня 2024 года.

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

Анатолю Бензеруку пашчасціла расці ў асяродку, які максімальна спрыяў развіццю яго асобы і раскрыццю таленту. Яго бацька — вядомы пісьменнік Расціслаў Бензярук. Кожны з творцаў — самакаштоўная зорка на літаратурным небасхіле; ёсць у бацькі з сынам і кнігі ў суаўтарстве.

Анатоль Бензярук скончыў гістарычны факультэт Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы, пазней атрымаў журналісцкую адукацыю. Лаўрэат Брэсцкай абласной літаратурнай прэміі імя Уладзіміра Калесніка, Нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі» і іншых прэстыжных творчых спаборніцтваў. Нястомны і руплівы краязнаўца, які шмат робіць для захавання гістарычнай памяці ў родным куточку Берасцейшчыны — Жабінкаўскім раёне.

У апавяданні, прапанаваным на конкурс «Звязды», пацярпелы ў аўтакатастрофе герой спакойна, без ценю самашкадавання фіксуе эпізоды бальнічнага жыцця. Але праз няшчасны выпадак, што прыкаваў яго да ложка, знаходзіць сваё шчасце... Аўтар па-майстэрску ўплятае ў тканіну сюжэта раман Уладзіміра Караткевіча, і чытачу застаецца толькі паўтарыць услед за класікам несмяротнае: «О, жыццё!»

Алена БРАВА.

Анатоль БЕНЗЯРУК

ЛЮБОЎ І КАХАННЕ

Я памятаю свой першы крок. Не, не той, калі быў дзіцём. А той, калі быў я ўжо вялікі, але зноў развучыўся хадзіць, і патрабавалася ўсё пачынаць спачатку.

Пасля той аварыі, калі мяне, беспрытомнага, выцягнулі з-пад белай машыны, і я амаль не бачыў белага свету, у мяне з'явілася шмат часу. І што цікава: да таго павароту, з-за якога выслізнула белае аўто, часу, каб паўсюдна паспяваць, вельмі не хапала, а тут раптам стала яго ўдосталь. Хоча-не, падзялюся?

Мяне збіралі «па частках» і амаль усяго склалі, як канструктар лега. Не хапала дзвюх драбніц: ногі развучыліся хадзіць і памяць адмаўлялася згадаць абставіны, што прывялі мяне на бальнічны ложак. Доктар Касміч абяцала: мінe час — і я ўсё прыпомню. Аднак час мінаў, памяць не спяшала вяртацца, а нейкія абрыўкі ўспамінаў не дазвалялі цалкам дамаляваць карціну.

Я зірнуў у люстэрка. Калі шрамы ўпрыгожваюць мужчыну, дык я быў прыгажуном казачным, можа, трохі зачараваным, якому зламалі нос, прыляпілі горб і пляскатыя, як у рыбы, вусны.

З доктарам Касміч мы пасябравалі адразу, з першага погляду, калі я толькі расплюшчыў вочы пасля доўгага хворага сну. На мяне з цікавасцю пазірала дзіцё або птушаня з вострай дзюбкай.

— Ты хто? — спытаў я.

— Я ваш лечачы ўрач, — адказала дзіцё і сарамліва заўсміхалася.

— Мой?

— Ваш, — зноў чырыкнула птушачка.

Жанчыну, якая так выглядае, яшчэ смела можна называць дзяўчынай і пытацца пра яе ўзрост. Аднак я не назваў і не спытаўся, бо зноў праваліўся ў сон.

Не ведаю, колькі спаў, але калі прачнуўся, у пакоі была цёмна, а побач — нікога. Мне нават падалося, што дзіця-птушаня мне прымроілася. Ды не. Праз нейкі час, як за акном пасвятлела, яно зноў зайшло і ўжо без усмешкі пахістала галавой:

— Навошта вы мяне палохаеце?

Мне спачатку падалося, што яна гаворыць пра мой непрэзентабельны выгляд (што праўда, тое праўда, мае цыліндр і смокінг пыліліся ў далёкай шафе). Аднак яе трывога была ад іншага: аказваецца, нада мною давялося варажыць усім аддзяленнем, выклікалі нават шматвопытнага Івана Ігнатавіча, каб вярнуць мяне, калі я раптоўна зноў зазбіраўся ў цемень — на іншы бок жыцця.

— Вярнулі, і што?

— Як што?! — абурылася мой маленькі ўрач. — Мы з вамі так не дамаўляліся.

Што праўда, тое праўда, з ёю мы не дамаўляліся. Ніяк не дамаўляліся... Мне стала непрыемна, і самае жахлівае — я ведаў, у чым непрыемнасць: мне не хацелася, каб яна бачыла мяне ў такім разабраным стане. Хай бы на мяне пазіраў шматвопытны Іван Ігнатавіч. І не таму, што ён шматвопытны. Проста няёмка, што мае цыліндр і смокінг недзе ў замкнёнай шафе, а перад дзяўчынай даводзіцца дэманстраваць прыгажосць сваіх шрамаў і пасудзіну пад ложкам.

* * *

Аналізуючы мае аналізы, Іван Ігнатавіч сказаў (так, ён так і сказаў):

— Аналізуючы вашы аналізы, я прыйшоў да высновы, малады чалавек, што вы нарадзіліся ў сарочцы.

Я міжволі зірнуў на сваю бальнічную сарочку і паспрабаваў паўтарыць: «аналізуючы аналізы». Ацаніў свае моўныя патугі — атрымалася на слабенькую «троечку», і зноў згадаў смокінг-троечку з далёкай пыльнай шафы.

— Дзякую.

— За што? — спытаў Іван Ігнатавіч.

— За «маладога чалавека». Мне ж хутка саракоўнік стукне.

— Кхе, ну якія нашы гады! — лагодна ўсміхнуўся ўрач. — Пасля такой аварыі і такіх аперацый вы памаладзелі на ўвесь саракоўнік да апошняй хвіліны... Ну, добра — назапашвайце сілы, яны вам яшчэ спатрэбяцца.

— А дзе... гэтая... ну-у-у...

— Любоў Антонаўна? Касміч?

— Так, Касміч.

— Ваш лечачы ўрач сёння адпачывае. Пакуль вы «спалі», яна тры змены адстаяла. Давялося ў загадным парадку адправіць адсыпацца, — сказаў Іван Ігнатавіч. — Але яна ўжо з ранку мне ўсе вушы пратрубіла: «Іван Ігнатавіч шаноўны, Іван Ігнатавіч даражэнькі! Вы ж толькі не забудзьцеся зайсці да майго пацыента». Забыцца пра пацыента?.. Эх-эх, быццам я нейкі Саргон Старажытны. Вось зараз абход скончу і пазваню — буду трымаць справаздачу перад доктарам Любоўю.

* * *

На трэці дзень урач сказаў:

— Тут да вас хадакі просяцца з белага аўтамабіля. За рулём знаходзілася жанчына. Была імжа, вы пераходзілі дарогу ў прыцемках, і яна вас не адразу заўважыла. А калі пабачыла, пачала рэзка тармазіць. Дзякуй богу, што пачала... Алкаголю ў крыві ні ў яе, ні ў вас не выяўлена. Суд, канечне, будзе, але строгасць прысуду залежыць і ад таго, ці напішаце вы заяву. Пусціць?

Яна ўвайшла. Я рукой паказаў на крэсла, і яна прысела. Некалькі хвілін доўжылася маўчанне. Нарэшце наведвальніца не вытрымала і хутка-хутка замармытала:

— Даруйце... даруйце... даруйце...

І гэты трыпціх, падмацаваны горкаю слязой, крануў сэрца. Заяву я пісаць не стаў, бо нарэшце ўспомніў: я — пісьменнік. Таму прасцей пісаць апавяданні...

Не такім ужо старым і тым больш зусім не дурнем быў Іван Ігнатавіч. Любачка не з'яўлялася некалькі дзён, а потым заходзіла двойчы на дзень, хоць я даўно ўжо не быў яе пацыентам...

...Я больш не палохаў доктара Касміч, і праз тыдзень яна літасціва пераводзіла мяне з рэанімацыі ў хірургію пад апеку Івана Ігнатавіча, але і пазней залятала нярэдка, «як матылёк на агеньчык».

Іван Ігнатавіч нават аднойчы прымусіў дзяўчыну пачырванець:

— Ах, Любоў Антонаўна, гэта ўжо мой пацыент, і ён у надзейных руках, — пры гэтым урач паказаў свае моцныя рукі і непрыкметна міргнуў мне.

Яна апусціла галаву, прыглушана прабачылася і выслізнула з палаты.

— Ну вось, стары дурань, збянтэжыў маладзіцу. А ты, хлопча, прыгледзься да Любові. Мо гэта і ёсць каханне?

Аднойчы яна спытала:

— Мне Іван Ігнатавіч сказаў... А вы і праўда пішаце кніжкі?

— Пакуль толькі адну напісаў. Я больш з перакладаў жыву: дапамагаю польскім, французскім і рускім аўтарам «загаварыць» па-беларуску. Перакладаю прозу і вершы.

— Вершы?

— Ну, вершы — трошкі.

Яна яшчэ больш ажывілася:

— Прачытайце што-небудзь, калі ласка.

Я крыху задумаўся, а потым прамовіў:

— Тады — пра любоў і каханне. Беларусы — людзі чуллівыя. Каб выказаць свае пачуцці, ім аднаго слова замала. Ёсць у нас любоў, але жыве сярод нас і каханне. Любіць можна і лапкі ў жабкі, а вось кахаць — толькі жанчыну або мужчыну. Сто дзевяноста гадоў таму жыў у маёнтку Доўгае на Пружаншчыне выдатны паэт. Ён пісаў па-польску, а я пераклаў на беларускую. Чытаць?

Доктар Касміч часта-часта захістала галавой, і я пачаў:

На мове душы
і на ўсіх іншых мовах
Ёсць два найдарожшыя,
ветлыя словы.
У іх, нібы ў кроплях расы і жыцця,
Закладзены скарб
для твайго развіцця.

Нібыта два яркія пёркі, паверце,
Дзве светлыя зоркі
ўвабралі ў сябе
Усё з нараджэння
да самае смерці.
У гэтых двух словах:

— Кахаю цябе!

— Прыгожа, — пахваліла дзяўчына і аўтара, і перакладчыка. — У нашай сям'і таксама праз літаратуру прыйшлі любоў і каханне. Майго тату завуць Антон Касміч, як галоўнага героя рамана «Чорны замак Альшанскі». Калі тата быў яшчэ кавалерам і заляцаўся да мамы, нават тое-сёе рыфмаваць спрабаваў, яна яму ў адказ паднесла томік Уладзіміра Караткевіча з «Чорным замкам» і «Дзікім паляваннем». Падаравала каханаму кнігу і ў канцы аўтограф пакінула: «Антону Касмічу Другому ад Любові Першай на доўгі добры ўспамін». Праз гэты раман у іх такі ра-а-ман завязаўся, што ў выніку і я прыйшла на свет. Каханне Другую Любоў нарадзіла...

* * *

Неяк непрыкметна і хутка мы перайшлі на «ты». Хоць не — прыкметна і памятна, бо ў тую раніцу я адарваўся ад свайго бальнічнага ложка і зрабіў свой першы крок.

Гэта яна мне строга загадала, калі ўвайшла ў палату:

— Ляжыш? Чаму ляжыш? Ідзі да мяне!

І я паслухаўся. Што мяне магло спыніць? Хто мне мог перашкодзіць?

Потым я еў кашу, а яна, шчаслівая, шчабятала:

— Упершыню бачу жывога пісьменніка.

— Дзякуй богу, што жывога.

— Ой, прабач, я не тое хацела сказаць.

— Нічога-нічога, я ўжо прывык, што жывы і пісьменнік.

— Я вось прынесла табе «Чорны замак»... А ты пра што зараз пішаш? — спытала Люба.

— Пра рознае. Найчасцей пра любоў і каханне, пра сябе, трошкі пра цябе і свой цыліндр ды смокінг, якія пыляцца ў далёкай шафе.

— У цябе ёсць цыліндр і смокінг?

Яна паклала руку на маю руку.

— Пакуль няма, але хутка давядзецца купіць...

Я глядзеў на Любоў закаханымі вачыма і лавіў у адказ яе падобны цёплы позірк.

Потым яна пайшла, каб вярнуцца пазней.

Калі санітарка прынесла вячэру, дзяўчына развіталася да заўтра. Яна прыкрыла асцярожна дзверы, пакінуўшы свой лёгкі непрыкметны след і саладосць любімага парфуму.

Я крыху пачакаў, зірнуў у зачыненае акно і раскрыў Караткевічаў раман на апошняй старонцы. Ніякага аўтографа там не было — толькі развітальныя словы класіка:

«Міргалі за адчыненым акном бясконцыя агні.

О, жыццё!»

Я ўстаў і расчыніў акно.

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор электронных торгов	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607
Продавец	ГЛХУ «Смолевичский лесхоз», Минская область, г. Смолевичи, ул. Торговая, д. 41
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by

Предмет электронных торгов: транспортное средство, спецтехника, бывшие в употреблении, расположенные по адресу: Минская обл., г. Смолевичи, ул. Торговая, 41

Лот №	Наименование	Начальная цена, с НДС, бел. руб.
1	**Грузовой бортовой тентовый UAZ 390945-460**, рег. знак АР 3320-5, 2016 г. в., № кузова XTT390945H1200813 390940G0493777	8 460,00
2	**Трактор «Беларус-892.2»**, рег. знак ОК-5 5998, 2013 г. в., № кузова 90823021	18 870,00
3	**Грузовой специальный самосвал MAZ 6501 A5-330-060**, 2010 г. в., рег. знак АК 1206-5, № кузова Y3M6501A5A0000062. **Прицеп специальный самосвал MAZ 8571-02**, 2012 г. в., рег. знак А 2591 В-5, № кузова Y3M857102C0000013	47 250,00

Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 11.10 30.08.2024.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Дата и время окончания приема заявок: заявки на участие в электронных торгах принимаются по **29.08.2024** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на сайте Государственного комитета по имуществу (http://gki.gov.by) от 14.08.2024 г.

Контактные телефоны:
+375 (17) 310-36-37; +375 (29) 154-34-35.
E-mail: auction@cpo.by

УНП 600023997

ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ,

опубликованную в газете «Звязда» от 11.05.2024 № 92 (30226)

по объекту строительства «Жилой комплекс с объектами социально-общественного назначения и подземными паркингами в квартале просп. Независимости – просп. Машерова – ул. Красной – ул. Киселева в г. Минске». 7-я очередь строительства. Жилой дом 7.1-7.3 по г. п. 2-й пусковой комплекс.

Общество с ограниченной ответственностью «АСТОМАКС» информирует о внесении в проектную декларацию, опубликованную в газете «Звязда» от 11.05.2024 № 92 (30226) (далее – проектная декларация), следующих изменений:

1. Первый абзац пункта 2.3 проектной декларации изменить и изложить в следующей редакции:

«2.3. Проектная документация имеет положительные заключения государственной экспертизы № 286-15/20 от 02.07.2020, № 286-15/20-Д1 от 20.07.2020, № 786-15/21 от 10.03.2022, № 786-15/21-Д1 от 01.04.2022, № 822-15/22 от 08.12.2022, № 822-15/22-Д1 от 08.02.2023 и № 443-15/24 от 16.07.2024, выданные республиканским унитарным предприятием «Главгосстройэкспертиза».

2. Первый и второй абзацы пункта 2.9 проектной декларации изменить и изложить в следующей редакции:

«2.9. Количество объектов долевого строительства, предлагаемых для заключения договоров, – 14 единиц, которые имеют общую площадь жилого помещения (согласно ТКП 45-3.02-324-2018) от 61,06 м² до 166,08 м²; номера объектов долевого строительства по проектной документации: 1, 2, 3, 4, 5, 6, 7, 8, 9, 10, 11, 12, 13, 14.

Общая площадь объектов долевого строительства, в отношении которых будут заключаться договоры создания объектов долевого строительства, составляет 1548,26 м²».

3. В остальной части проектная декларация продолжает действовать в редакции, опубликованной в газете «Звязда» от 11.05.2024 № 92 (30226).

4. Прием заявлений о заключении договоров создания объектов долевого строительства, предложенных к строительству настоящими изменениями проектной декларации, осуществляется при заключении названных договоров через 7 дней после опубликования настоящих изменений в проектную декларацию.

УНП 800017077

Извещение о проведении открытого аукциона по продаже не завершенного строительством незаконсервированного жилого дома с одновременной продажей земельного участка в частную собственность

Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by

Лот № 1. Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом: не завершенное строительством незаконсервированное капитальное строение (фундамент – столбы кирпичные, бетон, площадь застройки – 0 (53) кв. м, процент готовности – 9 %) с инвентарным номером 200U-81412 (срок консервации истек) и земельный участок с кадастровым № 221288109601000166, площадью 0,2500 га в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Октябрьский с/с, д. Сокольники, ул. Луговая, 11.
Начальная цена предмета аукциона (в т. ч. не завершенный строительством жилой дом/зем. участок): **16412,34** (1512,34/14900,00) бел. руб.
Задаток: 1 641,23 бел. руб.
Удельный вес стоимости не завершенного строительством жилого дома в начальной цене предмета аукциона – 9,21 %.
Лот № 2. Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом: не завершенное строительством незаконсервированное капитальное строение (фундамент – железобетон, площадь застройки – 0 (130) кв. м, процент готовности – 11 %) и земельный участок с кадастровым № 221288110101000144, площадью 0,1500 га в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Октябрьский с/с, д. Шапуры, ул. Победителей, 38.
Начальная цена предмета аукциона (в т. ч. не завершенный строительством жилой дом/зем. участок): 12774,99 (3474,99/9300,00) бел.руб.
Задаток: 1 277,50 бел.руб. Удельный вес стоимости не завершенного строительством жилого дома в начальной цене предмета аукциона – 27,20 %.
Реквизиты для внесения задатка по лотам 1,2: р/с BY17 AKBB 3604 3141 128 562 000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» БИК AKBBBY2X, УНП 300962400, код операции 40901. Получатель платежа: Октябрьский сельисполком

Дата, время и место проведения аукциона: **16.09.2024 в 15.00 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5, ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Срок внесения задатка и приема документов: с 08.30 15.08.2024 до 17.30 13.09.2024. Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 08.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

Условия для победителя аукциона либо единственного участника несостоявшегося аукциона: в течение 10 раб. дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся: внести плату за предмет аукциона, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; в двухмесячный срок со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся обратиться в РУП «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за государственной регистрацией права, ограничений (обременений) права на земельный участок; получить в установленном порядке разрешение Витебского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработать проект на строительство объекта в срок, не превышающий 6 месяцев с даты осуществления государственной регистрации права на земельный участок; к строительству жилого дома приступить после согласования в установленном порядке проектной документации; осуществить возведение жилого дома в сроки, установленные Указом Президента РБ от 07.02.2006 № 87, выполнить ввод жилого дома в эксплуатацию в соответствии с действующим законодательством.

Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме).

Аукцион проводится в порядке, установленном Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 № 220.

Для участия в аукционе приглашаются граждане РБ, консолидированные участники (двое и более граждан РБ), которые в установленный в извещении срок подают заявление об участии в аукционе с указанием предмета аукциона, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Предоставляются: гражданином РБ – копия документа, удостоверяющего личность без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина РБ – доверенность, оформленная в соответствии с требованиями законодательства; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе и доверенность. Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников в отношении каждого предмета аукциона. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением документации, необходимой для его проведения, перечисляются на р/с, указанный в протоколе аукциона. Информация об окончательных суммах затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходах, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, письменно доводится до сведения участников до начала проведения аукциона. Всем участникам предоставляется право ознакомления с документацией, а также возможность осмотра на местности предмета аукциона.

Конт. тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63; e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (*организатор аукциона*)

по поручению **ОАО «Солигорскторг»** (*продавец*)

проводит повторный открытый аукцион по продаже одним лотом имущества в составе:

• мастерская строительной группы, инв. № 644/С-34968, общей площадью 132,9 кв. м, расположенная по адресу: Минская область, г. Солигорск, ул. Коммунальная,12/1;
• склад одноэтажный, инв. № 644/С-34944, общей площадью 202 кв. м, расположенный по адресу: Минская область, г. Солигорск, район рынка «Колхозный»;
• склад одноэтажный *(составные части и принадлежности: проезд, площадка, 2 (два) ограждения)*, **инв. № 644/С-38829, общей площадью 429 кв. м, расположенный по адресу: Минская область, г. Солигорск, ул. Коммунальная, 12/2,**
• многолетние зеленые насаждения: (инвентарная карточка № ст-57 (клен – 2 шт., береза – 11 шт., липа – 3 шт., груша – 1 шт., ясень – 1 шт., туя – 1 шт., осина – 1 шт., тополь – 1 шт.).
• оборудование: пожарная сигнализация на объекте «Здание склада мастерской строительной группы», инв. № сг-7. Капитальные строения с инв. №№ 644/С-34968, 644/С-34944, 644/С-38829, многолетние зеленые насаждения и оборудование расположены на земельном участке: кадастровый номер 625050100001002273, площадь 0,4334 га, (право постоянного пользования).
Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона водопроводов, пл. 0,0793 га; охранная зона канализации, пл. 0,0878 га; охранная зона тепловых сетей, пл. 0,0025 га.
• автогараж № 3 *(составные части и принадлежности: смотровая яма)*, **инв. № 644/С-56580, общей площадью 32,5 кв. м, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 625050100001003037 (право постоянного пользования), площадью 0,0044 га, по адресу: Минская область, г. Солигорск, ул. Строителей, 2И.**
Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона сетей и сооружений канализации, пл. 0,0044 га.
• автогараж № 5, инв. № 644/С-56586, общей площадью 29,5 кв. м, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 625050100001003038 (право постоянного пользования), площадью 0,0042 га, по адресу: Минская область, г. Солигорск, ул. Строителей, 2Ж.
Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона сетей и сооружений канализации, пл. 0,0042 га; охранная зона сетей и сооружений водоснабжения, пл. 0,0011 га.

Начальная цена с НДС (20 %) – **339 568,64** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **33 956,00** бел. руб.
Начальная цена снижена на 40 %.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169 330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Проект договора купли-продажи соответствует приложению к решению Солигорского районного исполнительного комитета № 3668 от 28.12.2012.

Оплата производится в следующем порядке:

- оплата 30 (тридцать) процентов стоимости имущества в течение 20 (двадцати) календарных дней после заключения договора с возможной рассрочкой оплаты оставшихся 70 (семидесяти) процентов в течение 5 (пяти) календарных месяцев (по 14 %) с учетом ежемесячной индексации цен производителей промышленной продукции производственно-технического назначения, которые рассчитываются и публикуются Национальным статистическим комитетом Республики Беларусь, либо по соглашению между сторонами на иных условиях договора.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на его проведение, в размере 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона (Объектов).

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 29.12.2022, 02.03.2023, 18.04.2023, 19.05.2023, 14.07.2023, 16.08.2023, 23.11.2023, 01.02.2024, 29.05.2024.

Аукцион состоится **29.08.2024** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **28.08.2024** до **16.00** по указанному адресу **в каб. 320.**

Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 029 136-31-11.
Тел. для осмотра 8 (0174) 260-731.

УНН 600122715

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона/ оператор	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. www.ipmtorgi.by
Продавец	ОАО «Шени-агропродукт», УНП 200026194; 225170, Брестская область, Пружанский район, д. Шени, ул. Центральная, д. 52

Предмет электронных торгов: транспортные средства и спецтехника (бывшие в употреблении), расположенные по адресу: Брестская область, Пружанский район, д. Шени

Лот №	Инв. номер	Наименование	Год выпуска	Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб.
1	250310	**Трактор «Беларус 3022ДЦ1», рег. знак АВ-1 4798**	2010	**109 680,00**
2	1871	**Автомобиль MAZ 555142 4231РБ, рег. знак АР 4840-1**	2009	**23 880,00**

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB30120 048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней со дня завершения электронных торгов. Продавец составляет и направляет договор купли-продажи для подписания победителю аукциона

Срок оплаты предмета электронных торгов: 100 % предоплата в течение 3 банковских дней с момента заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **4 %** от цены продажи лота № 1 и **6 %** от цены продажи лота № 2 в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов. Подробная информация по размеру затрат и вознаграждения опубликована на сайте www.ipmtorgi.by в карточке предмета электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Дата и время начала и окончания электронных торгов: 16.09.2024. с 11.00 до 12.00.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Дата и время окончания приема заявок: заявки на участие в электронных торгах принимаются по **13.09.2024 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Контактные данные	**Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44)-704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by**

ГЛЯДЗЕЦЬ ВА ЎСЕ ВОЧЫ?.. МОЖНА!

Захаваць зрок дапамагае навука

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Афтальмалогія — адзін з кірункаў медыцыны, які найбольш імкліва развіваецца. Кожны новы крок у навуцы прыводзіць да з'яўлення новых магчымасцяў, якія дазваляюць урачам хутчэй выяўляць захворванне і больш эфектыўна лячыць пацыента. У 2023 годзе ў Беларусі колькасць высокатэхналагічных аперацый вырасла ў параўнанні з 2022-м на 50 %. Штогод толькі на базе Рэспубліканскага афтальмалагічнага цэнтра выконваецца каля двух дзясяткаў тысяч лазерных аперацый, яны ў структуры хірургічных умяшанняў у орган зроку складаюць 40 %. Пра інавацыі ў афтальмалогіі расказалі спецыялісты.

ВЫСОКІЯ ТЭХНАЛОГІІ, ДАСТУПНЫЯ КОЖНАМУ

Высокаспецыялізаваная афтальмалагічная дапамога аказваецца ў Рэспубліканскім афтальмалагічным цэнтры на базе 10-й гарадской клінічнай бальніцы Мінска.

— Наша навуковая школа складаецца з дактароў, якія працуюць на базе 10-й клінічнай бальніцы. Акрамя супрацоўнікаў кафедры, там практыкуюць пяць кандыдатаў медыцынскіх навук. Зацверджаны тэмы дысертацыйных даследаванняў яшчэ чатыром урачам, дзве абароны дысертацый на падыходзе — у нас атрымліваецца ўнікальны рэспубліканскі афтальмалагічны цэнтр, дзе навука непасрэдна звязана з практыкай, — расказвае **галоўны пазаштатны афтальмолаг Міністэрства аховы здароўя, загадчыца кафедры афтальмалогіі Інстытута перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі кадраў аховы здароўя БДМУ Таццяна ІМШАНЕЦКАЯ.** — Акрамя таго, дапамагае ў аказанні спецыялізаванай дапамогі Дзіцячы рэспубліканакі афтальмалагічны цэнтр на базе 4-й дзіцячай клінічнай бальніцы, РНПЦ радыяцыйнай медыцыны і экалогіі чалавека, РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі, РНПЦ «Маці і дзіця», з якімі мы цесна кантактуем.

Усяго ў 2022 годзе было праведзена 44 988 аперацый, у 2023-м — 53 435. Часцей яны патрабаваліся пацыентам з катарактай, глаўкомай, адслаеннямі сятчаткі. Аперацыі пацыентаў з катарактай склалі звыш 50 % ад усёй колькасці.

У 2022 годзе зацверджаны клінічныя пратаколы, якія акумулявалі самыя інавацыйныя метады дыягностыкі і лячэння афтальмалагічных паталогій. Гэтыя пратаколы грунтуюцца на ўкараненні навуковых распрацовак айчыннай афтальмалогіі і сучасных міжнародных стандартах. Таксама ў Беларусі развіваецца практыка-арыентаваная навуковая дзейнасць. Усе дасягненні, якія з'яўляюцца на кафедры афтальмалогіі Інстытута перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі кадраў аховы здароўя БДМУ, знаходзяць прымяненне ў практыцы.

Афтальмолагі часта ставяць дыягназ пацыентам з іншымі хваробамі. Менавіта орган зроку дапамагае выявіць цукровы дыябет, захворванні крыві развітой стадыі, розныя сістэмныя захворванні. Таму афтальмолагі працуюць у міждысцыплінарнай камандзе з калегамі: неўролагамі, рэўматолагамі, тэрапеўтамі, кардыёлагамі, эндакрынолагамі.

Самая вялікая дыспансерная група сярод тых, хто мае афтальмалагічныя захворванні, — пацыенты з глаўкомай. Гэта паталогія дае самы вялікі працэнт інваліднасці па зроку. Аднак хворыя абаронены дзяржавай: усе лекавыя прэпараты, якія прыводзяць да зніжэння ўнутрывочнага ціску, лазерныя метады лячэння, пластычная хірургія, мікрахірургія праводзяцца толькі на бясплатнай аснове, пры неабходнасці — з прымяненнем высокатэхналагічных, інавацыйных дрэнажных прылад. Усе віды лазерных умяшанняў, якія толькі магчымы ў свеце, праводзяцца ў Беларусі, і не толькі на рэспубліканскім узроўні, але і на абласным і гарадскім.

На самым высокім узроўні аказваецца неадкладная афтальмалагічная дапамога. У 2022 годзе па неадкладных паказаннях было выканана 4467 аперацый, у 2023-м — 4259. У 2023 годзе колькасць пралечаных пацыентаў вырасла на 13 % у параўнанні з 2022 годам, аперыраваных пацыентаў — на 26 %, аперацый — на 19 %. Пры гэтым колькасць высокатэхналагічных аперацый вырасла на 50 %, а складаных — на 27 %. Усяго ў 2022 годзе было праведзена 44 988 аперацый, у 2023-м — 53 435. Часцей яны патрабаваліся пацыентам з катарактай, глаўкомай, адслаеннямі сятчаткі. Аперацыі пацыентаў з катарактай склалі звыш 50 % ад усёй колькасці.

Дарэчы, за суткі дактары Рэспубліканскага афтальмалагічнага цэнтра могуць прыняць каля 140 пацыентаў.

— Санавіяцыяй нам дастаўляюць людзей з любога рэгіёна Беларусі. Напрыклад, нядаўна з Віцебскай вобласці — са складанай лакалізацыяй унутрывочнага іншароднага цела. У нашай краіне гэта адбываецца вельмі хутка. Прычым пацыент ужо гатовы да эндатрахіяльнага наркозу, і дапамога аказваецца імгненна, — расказала Таццяна Імшанецкая.

ЛАЗЕРНАЯ КАРЭКЦЫЯ

Асаблівае месца ў практыцы ўрачоў рэспубліканскага цэнтра займаюць лазерныя тэхналогіі. Тут прадстаўлены поўны іх спектр.

— Мы можам дапамагчы пацыентам з рознай паталогіяй сятчаткі: разрывамі, перадразрывамі, дыстрафіяй, адслаеннямі. Захоўваем зрок камарбідным пацыентам з трамбозамі, цукровым дыябетам, сасудзістай паталогіяй. Дапамагаем хворым справіцца з глаўкомай, калі медыкаментознай тэрапіі недастаткова, а на хірургію ён пакуль не рашыўся. Можам дапамагчы, калі пасля аперацый па катаракце не дасягнулі жаданай вастрыні зроку. Калі хірургі не трапілі ў патрэбную рэфракцыю, можам дадаць лазерных метадаў карэкцыі —творча падыходзім да работы, — расказала **ўрач аддзялення лазернай мікрахірургіі вока (в. а. загадчыка аддзялення) 10-й гарадской клінічнай бальніцы Алена ГЕРАСІМЕНКА.**

Тут выконваюцца аперацыі і пры розных анамаліях рэфракцыі. Карэкцыю зроку праводзяць як стандартным метадам, так і пры дапамозе высокатэхналагічнага фемталазера. Апошні можа быць выкарыстаны пры перасадцы рагавіцы, гэта новы кірунак, які дазваляе больш дакладна і якасна зрабіць трансплантат, паскорыць яго зажыўленне і зменшыць колькасць ускладненняў. Прымяняюцца тэхналогіі, якія дазваляюць у шэрагу выпадкаў асісціраваць пры дапамозе фемталазера.

Большасць лазерных аперацый праводзіцца без шпіталізацыі, што вельмі камфортна для пацыентаў і скарачае затраты на лячэнне.

Сёлета на базе клінікі было выканана больш чым 5,5 тысячы лазерных каагуляцый сятчаткі, звыш за 1,5 тысячы дысцызій (гэта аперацыі пры другасных плёнчатых катарактах), амаль 1700 лазерных аперацый пры глаўкоме, каля 900 лазерных карэкцый зроку. Апошнія выконваюцца на платнай аснове, усе астатнія — бясплатныя. Лазерныя аперацыі складаюць больш за 40 % ад усіх, якія выконваюцца ў краіне.

ПРАРЫЎ У ЛЯЧЭННІ РЭТЫНАПАТЫІ НЕДАНОШАНЫХ

Пра інавацыі ў дзіцячай афтальмалогіі расказала **галоўны пазаштатны дзіцячы афтальмолаг Міністэрства аховы здароўя, прафесар кафедры афтальмалогіі Інстытута перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі кадраў аховы здароўя БДМУ Віктарыя КРАСІЛЬНІКАВА.**

— Усе інавацыі, якія прымяняюцца не толькі ў медыцыне, але і ў навуцы ў цэлым, актыўна ўкараняюцца і ў афтальмалагічную практыку. У апошнія гады афтальмалогія выходзіць за рамкі ўласна афтальмалагічных праблем і ператвараецца ў мультыдысцыплінарную навуку. Гэтае ўзаемадзеянне набывае сапраўды інавацыйны характар з прыцягненнем самых сучасных метадаў дыягностыкі і лячэння, — адзначыла Віктарыя Красільнікава.

Яна падкрэсліла, што адной з галоўных інавацый з'яўляецца спроба выкарыстання ў дыягностыцы штучнага інтэлекту, які з'яўляецца будучыняй медыцыны і афтальмалогіі. Акрамя таго, да інавацый адносяцца медыцынская робататэхніка, нашэнне прылад для маніторынгу здароўя, аналіз і рэдагаванне геному, тэхналогіі віртуальнай і дапоўненай рэальнасці, імплантаваныя прылады і пратэзы, сістэмы дастаўкі лекаў, а таксама розныя імплантацыйныя тэхналогіі: ад штучных крышталікаў да спроб стварэння штучнага вока. Найбольшую папулярнасць і запатрабаванасць на сёння мае тэлемедыцына. Асноўны кірунак развіцця дзіцячай афтальмалогіі — ва ўзаемадзеянні са спецыялістамі з іншых абласцей медыцыны.

Сярод найбольш частых прыроджаных прычын слепаты ў дзяцей — анамаліі развіцця сятчаткі і глядзельнага нерва, прыроджаная глаўкома і прыроджаная катаракта.

— На высокім узроўні ў нас ажыццяўляецца хірургія прыроджанай катаракты, якая можа пачынацца з дня нараджэння дзіцяці. Аперацыя ўключае ў сябе не толькі імплантацыю штучнага крышталіка, але і выкарыстанне 3D-хірургіі. Таксама мы навучыліся вельмі добра спраўляцца з прыроджанай глаўкомай. Самае прыемнае, што цяпер на тэрыторыі Беларусі даступна лячэнне анамалій развіцця сятчаткі, у прыватнасці хваробы Лебера і пігментнай дэгенерацыі. У краіне зарэгістраваны прэпарат, які дазваляе лячыць гэтую паталогію, — расказала дзіцячы афтальмолаг.

З набытых захворванняў, якія ўплываюць на інваліднасць дзяцей, можна вылучыць рэтынапатыю неданошаных. Але ў апошнія гады і тут адбыўся прарыў у лячэнні. Гэта датычыцца не толькі лазерных і крыятэхналогій.

— Летась мы атрымалі магчымасць выкарыстоўваць прэпараты з групы Anti-VEGF, якія дазваляюць затармазіць актыўны рост сасудаў або перавесці іх у зоны, якія не з'яўляюцца зрокава важнымі, — удакладніла Віктарыя Красільнікава.

Як дадала Алена Герасіменка, рэтынапатыя неданошаных — асаблівае захворванне з цяжкімі наступствамі, адна з прычын слепаты і дрэннага зроку не толькі ў нашай краіне, але і ва ўсім свеце.

— За апошнія гады на больш высокі ўзровень выйшла аказанне хірургічнай дапамогі, лазернай каагуляцыі сятчаткі, дзякуючы чаму ў нас амаль няма сляпых дзяцей. У 2006 годзе, калі мы пачыналі, іх штогод з'яўлялася каля 50, і гэта была вялікая праблема. На сёння дапамога аказваецца своечасова, што дае магчымасць да тэрміну нармальных родаў правесці аперацыю: калі дзіця нараджаецца на 23—30-м тыдні, звычайна на 35-36-м тыдні яму робіцца ўмяшанне, — расказала Алена Герасіменка.

Аднак такія пацыенты патрабуюць увагі і ў далейшым.

— Наступствы рэтынапатыі неданошаных сказваюцца і пазней. Калі ўдалося захаваць зрок у дзяцінстве, можна страціць яго ў падлеткавым ці маладым узросце, — адзначыла афтальмолаг. — Гэта вялікая праблема, і мы шукаем яе рашэнне. Ствараюцца ўмовы для максімальна бескантактнай і дакладнай дыягностыкі, на базе нашага аддзялення даступны ўвесь спектр высокатэхналагічных працэдур.

